ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 212 (3320) Аўторак 17-га верасьня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, намітатар—619, кантора—781

ТОКІЁ, 16. Прыбыўшы ў Моджы з Дайрэну камандзір 16-й японскай дывізіі ген. Мацуі заявіў журналістым, што па сваей баяздольнасьці Чырвоная армія стаіць вышэй кітайскай. Па думцы Мацуі, Чжан Сюэ-лян разгадаў тактыку Нанкіна і больш ня будзе пасылаць войска на граніцу

АПОШНІЯ ЧАВІНЫ Б. С. С. Р.

Нам. Наркамвасн'а СССР т. Камянеу у Бабруйску

РАЁН МАНЭЎРАЎ. Увечары 15-га верасьня на «фронце» зацішша. Раніцаю 16-га верасьня чакаюць вырашаючых «баёў», якія азначаць выніку першага ходу манэўраў.

15 верасьня ў Бабруйск прыбыў і паехаў «на фронт» т. Камянеў.

Для ўдзелу ў манэўрах, для азнаямленьня з бытам Чырвонаармейцаў і для дапамогі паліторганам у культрабоце, у Бабруйск прыбыла група беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў

Пачаліся вялікія Бабруйскія манэўры

МАНЭЎРЫ—БАЯВЫ АГЛЯД АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ ЎСЁЙ НАШАЙ КРАІНЫ

Манэўры—гэта вышэйшая ступень тактычнай і палітычнай падрыхтоўкі войск, справаздача аб дасягненьнях у вучобе

Рабочыя і сяляне! Дапамагайце Чырвонай арміі--вашаму вернаму абаронцы ад паноў і капіталістых

Баявыя дзеяньні пачаліся

БАБРУЙСК, 14. (Наш. кар.). Сёньня пачаліся Бабруйскія манэўры. У першы дзень дзейнічае толькі авіяцыя абодвых бакоў, якая, вядучы разведку робіць налёты. Наземнае войска выступіла з раёнаў для заняцьця выточнага становішча. Маршы адбываюцца пабаявому — з усімі мерамі аховы і разьведкі. Баявыя дзеяньні пачаліся ноччу на пятнаццатае. Настрой часьцей добры.

На Бабруйск было некалькі налётаў сініх. Адзін налёт быў асабліва ўдалым. Самалёты сініх, падыйшоўшы на вышыні чатырох тысяч мэтраў, маскуючыся хмарамі, раптам наляцелі на горад і закідалі бомбамі некаторыя важныя пабудовы і скапленьні часьцей.

Асоавіяхімаўскія каманды дэгазавалі ўмоўна заражаныя вучасткі і праводзілі неабходныя работы па абароне. Заўважваюцца нясур'ёзныя адносіны часткі насельніцтва да трывог. Натоўпы разяў перашкаджаюць работам каманд.

ПРАВЕРКА І ВУЧОБА

(Артыкул члена РВС БВА тав. Кажэўнікава)

Манэўры зьяўляюцца ня толькі праверкай часьцей і кіраўніцтва, але і добрай і баявой вучобай. Манэўры найбольш набліжаюць вучобу да сапраўднай баявой абстаноўкі. Тут правяраюцца і вучацца чырвонаармеец, камандзір, палітработнік, доктар і г. д. Іменна і правяраюцца і вучацца, як трэба змагацца з ворагамі рабочых і сялян, як з меншымі сіламі, з меншымі ахвярамі і затратамі перамагчы ворага. Гэта можна зрабіць толькі пры ўмове сьвядомых адносін усіх, ад чырвонаармейца і да вышэйшага камандваньня, да гэтай справы.

Хуткасьць, выкананьне, акуратнасьць, здагадлівасьць, бесьперабойная работа бліжэйшага тылу — самая неабходная ўмова пасьпяховасьці і павучальнасьці манэўраў.

Але гэта ня ўсё. Самая лепшая падрыхтоўка часьці нічога ня будзе варта, калі часьці няпісьменныя палітычна, калі яны адарваны ад агульнага палітычнага жыцьця, ад рабочых арганізацый, а, значыць, ад бягучай палітыкі. Сувязь часьцей Чырвонай арміі з працоўным насельніцтвам, узаемная дапамога, уцягненьне працоўных у справу ўмацаваньня баяздольнасьці Чырвонай арміі і ўцягненьне часьцей арміі ў жыцьцё і работу рабочых, беднякоў, сераднякоў і батракоў — замацуе нашы баявыя рады, дасьць нам новыя сілы ў цяжкой вучобе.

Манэўры гэтага году праходзяць у абстаноўцы цкаваньня, правакацый з боку капіталістычных краін у адносінах да Савецкага Саюзу, у абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы ў горадзе і вёсцы.

Няхай злуюцца ворагі сацыялізму, які будуецца, мы будзем рабіць сваю справу: будаваць новае, сьветлае жыцьцё. Але мы, у той-жа час не дамо сябе закабаліць, мы рыхтуемся да адпору ворагу і дамо адпор жорсткі.

Няхай жыве Рабоча-Сялянская Чырвоная армія!

Няхай жыве Савецкі Саюз!

Няхай жыве ЎсеКП(б)!

Баявыя традыцыі бальшавізму--зрабіць уласнасьцю працоўных мас

Непарыўны рост супярэчнасьцяй паміж працай і капіталам, узмацненьне небясьпекі ўзброенага нападу сусьветнага імпэрыялізму на Савецкі Саюз, вострa дыктуюць нам скансэнтраваць асаблівую ўвагу партыі, рабочае клясы, усіх працоўных на пытаньнях абароназдольнасьці краіны.

БССР зараз пераважвае сур'ёзную праверку сваёй гатоўнасьці да справы абароны, сваёй здольнасьці быць аванпостам пралетарскае дзяржавы.

Вялікія манэўры Чырвонае арміі, што адбываюцца на тэрыторыі Беларусі, зьяўляюцца іменна такім генэральным праглядам ўсёй нашай баявой гатоўнасьці. Недарма яны прыцягнулі да сябе ўвагу ўсёй КП(б)Б, усёй савецкай грамадзкасьці.

У агульнай суме пытаньняў, зьвязаных з правядзеньнем манэўраў, ва ўсёй сыстэме мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць іх посьпех, **першачарговае значэньне набывае мабілізацыя ўвагі самых шырокіх мас працоўных на пытаньні кіруючай ролі і значэньні камуністычнае партыі ва ўсім будаўніцтве ўзброеных сіл пралетарскае дыктатуры.**

Папулярызацыя Чырвонай арміі, уся выхаваўчая работа вакол яе баявых традыцый, растлумачальная работа ў сувязі з заклікам новага папаўненьня ў армію — усё гэта павінна быць цесна ўвязана з задачай згуртаваньня працоўнага насельніцтва пад сьцягамі партыі. Армейскія паліторганы, партыйныя камітэты, палітасьветорганы, за час манэўраў, павінны з усёй поўнасьцю асьвятліць работу партыі бальшавікоў па стварэньні ўзброеных сіл пралетарскае рэвалюцыі, паказаць, што партыя была арганізатарам перамог у грамадзянскую вайну, што яна зьяўляецца кіраўніком усяго сучаснага ваеннага будаўніцтва, і што яна павядзе за сабою мільёны працоўных у будучых бойках за кастрычнікавыя заваяваньні.

Той самаадданы гэраізм, самаахвярнасьць, сапраўдныя цуды адважнасьці, сьмеласьці і вытрыманасьці, якімі поўна гісторыя барацьбы бальшавікоў з царскім самаўладзтвам і грамадзянская вайна, — трэба яшчэ раз наглядна паказаць працоўнаму насельніцтву, зрабіць гэта ўласнасьцю шырокіх мас, каб яшчэ больш замацаваць у іх сьвядомасьці неабходнасьць згуртаваць свае рады вакол свайго калектыўнага правадыра і арганізатара. На слаўных баявых традыцыях бальшавізму трэба больш выхоўваць наш камсамол, рабочую моладзь, усё наша маладое працоўнае пакаленьне.

Манэўры, якія выклікалі вялізны ўздым увагі да пытаньняў абароны краіны, павінны быць для гэтай мэты ўсямерна скарыстаны.

Б. ПАПОЎ.

Наша моц у непарыўнай сувязі працоўных з Чырвонай арміяй

МАГІЛЕЎ, 16. (Па тэлеграфу ад нашага спэцкора). Працоўныя Магілеўшчыны з нябывалым энтузіязмам праводзілі № дывізію на манэўры. Провады вылліся ў магутную дэманстрацыю сувязі рабочых з Чырвонай арміяй. Па прадпрыемствах гораду сабрана 5.000 рублёў на ўзмацненьне палітасьветработы ў часьцях і на падарункі байцом. Дзесяцітысячны мітынг горача вітаў Чырвоную армію і пажадаў посьпехаў у баявой вучобе.

— У патрэбны момант мы, як адзін, устанем у рады арміі, — заявілі выступаўшыя рабочыя.

Учора адбыўся вялікі паход у лягеры.

На радзе сялянскіх сходаў пастаноўлена ўрачыста сустракаць байцоў і падрыхтаваць кватэры.

СУСТРЭЧА САМАРЦАЎ

(МАЛЮНАК З НАТУРЫ)

Халодны пахмурны дзень. Час ад часу з-за хмар выглядае сонца, абагараючы сваімі праменьнямі байцоў, але больш за ўсё выпаўзаўшыя з-за краявіду хмары паліваюць іх халодным дажджом.

Мы рухаемся. Павольна дзень клоніцца да вечару. Ні байцом, ні іх верным баявым таварышом-коням пахмурнае надвор'е і дождж ні па чым. Сьпевы, частушкі, жарты, гукі аркестру — усё зьліваецца ў адно. На тварах бадзёрасьць. Нават лес, як-бы адчуваючы гэта, ня гледзячы на надыходзячы змрок і дождж, неяк праясьніўся і сваімі цяжкімі галінамі ўсьміхаецца, вітаючы байцоў.

Здалёк відна вёска. Па калёне пранеслася каманда: аркестр наперад, рысью. І гучна ляскаючы меднымі трубамі, трубачы паскакалі наперад.

Вось і вёска. У цемнаце замігацелі стракатыя хустачкі і шапкі. Неяк асабліва вызначаюцца тры сялянскія фігуры, якія трымаюць у сваіх руках баханак хлеба з сольлю і тоўстыя снапы жыта і пшаніцы. Па абодва бакі дарогі шчыльная сьцяна жыхароў вёскі. Тут і старыя, дзяўчаты, старухі, дзеці, хлапцы — уся вёска на вуліцы. Плякаты, сьцягі. Ня гледзячы на дождж і начную цемнату, яны выйшлі сустракаць Чырвоную армію. І калі галава калёны параўнялася з селянінам з баханкай хлеба і сольлю, ён, неяк падбадзёрыўшыся і выцягнуўшыся ў струнку, нясьмелым, але прыемным барытонам сказаў: «вернаму вартаўніку граніц СССР—абаронцы нашых інтарэсаў, рабоча-сялянскай Чырвонай арміі — прывітаньне ад працоўнага сялянства. Ура». Ур-а-а-а — пранеслася ў адказ.

— Працоўным сялянам — нашае палкае кавалерыйскае прывітаньне!

— Няхай жыве цесная сувязь рабочых і сялян з Чырвонай арміяй!

— Ура! У-р-а-а!

Гадзіны дзьве гучнае «ура» неслася па вёсцы і толькі з апошнім прайшоўшым чырвонаармейцам разыходзіліся сяляне па хатах.

Наступная вёска. Той-жа малюнак, але яшчэ больш энтузіязму. Да ўсяго сказанага тут байцоў літаральна закідваюць кветкамі. Нават дождж ні па чым. Яго ніхто не адчувае. А разьмясьціўшыся на начлег — гутаркі, сходы. І зноў прывітаньні, зноў радасьць. Замест кветак тут ужо падарункі, скромныя, але дарагія падарункі, іменна дарагія, бо іх дае селянін, які ясна бачыць сваю сілу, апору і абарону ў Чырвонай арміі.

І, гледзячы на гэты малюнак, становіцца ясным наша магутнасьць і сіла. У такім згуртаваньні, мы сапраўды моцныя і непераможныя.

ГРЫШАНАЎ.

Раён манэўраў.

ПАХОД

Сыгнал на трывогу
паклікала раньне,
з бліскуючых вачэй
кветкі сну пазрываны.
І мерна на плечах
калышуцца хвалі,
ў пагрозу штыхоў
пераплаўленай сталі.
Чамусьці, з хваста
абышоўшы калёну,
ледзь чутна паклікаў
мяне аддзялённы.
— На край таго лесу,
дзе яркія зоры,
мы пойдзем з табою
сягоньня ў дазоры.
Бо там, дзе палотны
Тугою надзьмуты,
апошні прыпынак,
апошні рэдут іх.
Я ўправа,
ты ўлева...
Паціснулі рукі
і сэрца да сэрца
прамовіла стукам:
— пам прыдзецца
хутка ажыцьцёвіць іх,
папужанасьць
гэтакіх рэпэтыцый!
і гэтак згубіліся
ў змроку зялёным,
чырвонаармеец
з сваім аддзялённым,
каб зноў,
пад іголкамі белых акацый,
у новай разведцы
на фронце спаткацца.

Максім Лужанін

АРГАНІЗУЕМ ГРАМАДЗКУЮ ДАПАМОГУ ПРЫЗВАНЫМ НА МАНЭЎРЫ

У зьвязку з манэўрамі ў вайсковыя часьці БВА ўліваецца шмат пераменнага складу (з запасьнікаў). Няма чаго і гаварыць, якое вялікае значэньне для павышэньня абароназдольнасьці краіны мае гэта мера! І чым больш бадзёры настрой у пераменьнікаў, чым мацней у іх баявы дух, тым з большым посьпехам пройдуць манэўры і тым большаму навучацца самі пераменьнікі.

У галіне забесьпячэньня сем'яў пераменьнікаў у нас ёсьць яшчэ рад няўвязак. Не пасьпее прызыўнік прыйсьці ў часьць, як следам за ім ляціць даведка сельсавету ...«дана такому, што ў яго ў хаце засталася адна працаздольная (жонка) і няма каму даглядаць за гаспадаркай». Або ...«у такога жонка цяжарная» і г. д., і г. д. І ўсе такія даведкі выдаюцца для таго, каб прызваны быў зараз-жа адпушчаны дамоў, інакш моў, за той месяц, што ён прабудзе ў арміі, загіне ўся яго гаспадарка.

Дапусьцім, што ў якога-небудзь прызванага ў армію жонка сапраўды ня справіцца з гаспадаркай. Дык хіба-ж мясцовая грамадзкасьць — партыйная ячэйка, камсамол, камітэт узаемадапамогі, калгас — хіба пры жаданьні яны ня здолеюць на працягу месца зьвярнуць увагу на дапамогу гаспадарцы, якая мае ў гэтым патрэбу? Замест таго, каб выдаваць паказаныя даведкі, трэба на месцы правесьці работу, якая ўмацоўвае армію, і тады ні ў жонак, ні ў самога прызванага ня будзе ныцьця.

У працягу месяца ўзяць на грамадзкае падтрыманьне сем'і некаторых (тых, што сапраўды маюць патрэбу) прызваных — гэта справа надавычайна лёгка можа быць ажыцьцёўлена, калі толькі партыйныя і камсамольскія ячэйкі, камітэты ўзаемадапамогі, кааперацыя возьмуцца за яе, як трэба.

Пытаньне аб арганізацыі рэальнай дапамогі прызваным павінна тэрмінова, неадкладна паўстаць перад усімі пералічанымі грамадзкімі арганізацыямі і ў першую чаргу перад партыйнымі.

Па выніках гэтай работы трэба меркаваць аб гібкасьці, чуласьці і ўменьні ператвараць у жыцьцё агульныя дырэктывы ў нашых нізавых арганізацыях.

Ва ўсякім выпадку, усякія скаргі прызваных на адсутнасьць работнікаў у гаспадарцы павінны быць ліквідаваны грамадзкай дапамогай.

Ф. ЖУКАЎ.

Чырвоны Крыж за работай

РАЁН МАНЭЎРАЎ. №-я санітарная каманда беларускага таварыства Чырвонага Крыжу, якая складаецца пераважна са студэнтак школы мэдычных сёстраў, на прызначанае месца прыбыла ў поўным складзе і добрым выглядзе

Адразу пасьля прыбыцьця была разгорнута работа па арганізацыі эвакапрыёмніка для хворых чырвонаармейцаў. Памяшканьне было грунтоўна вымыта, вычышчана, груз распакаваны, абсталяваньне растаўлена і разам з пэрсаналам цалкам падрыхтавана да пачатку «апэрацый».

Адносіны з боку партыйных і савецкіх органаў самыя найлепшыя — усе выказваюць сур'ёзную ўвагу і зацікаўленасьць да работы. Разгорнуты эвакапрыёмнік Чырвонага Крыжу ўвесь час наведваюць прадстаўнікі вышэйшага вайсковага і медыцынскага камандваньня. Водгукі іх вельмі добрыя.

Прадуктамі нас забясьпечвае мясцовая кааперацыя; спачатку былі некаторыя няўвязкі, якія тут жа выпраўляюцца.

Пачалі да нас прыбываць хворыя — ёсьць ужо некалькі чалавек хворых на панос. З работай сёстры і ўвесь пэрсанал спраўляюцца ўпэўнена і бадзёра.

А. Ц—ч.

Будуем самалёт „Чырвоны Партызан Беларусі"

Сеньнін па выкліку Пятровіча ўносіць **15 руб.** і выклікае асабіста чырвоных партызан: т. **Славінскага** — сакратара Менскага акругкому; т. **Сянкевіча**—заг. АПА ЦК КП(б)Б, т. **Гурэвіча**—сакратара Фрунзаўскага райкому, **Каранеўскага** — ВДУ, т. **Аўчыньнікава** — Камвуз, т. **Бэнэка** — Наркамгандаль, т. **Коўзана** — загад. сталоўкай № 3, т. **Жана** — ДПУ, Віцебск, т. **Валодзька** — старшыню акрвыканкому, Віцебск, т. **Фыльмновіч Ф.** — АПА кааперац. Полацку, т. **Прэкоф'ева** — Менск і чырвоных партызан Гусьлянскага калектыву Магілеўскае акругі і раёну.

Мы імкнемся да міру, але гатовы даць адпор усялякім спробам узброенага нападу імпэрыялістых на Савецкі Саюз

Спробная мабілізацыя прайшла пасьпяхова

ПРАЦОЎНЫЯ БАБРУЙШЧЫНЫ І МАГІЛЕЎШЧЫНЫ ПАКАЗАЛІ СВАЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА АБАРОНЫ САВЕЦКІХ МЕЖАЎ!

Падняліся, як адзін

Спробная мабілізацыя на Бабруйшчыне спаткана рабочымі, беднатой і сераднякам з энтузіязмам, які знайшоў сваё яскравае знадворнае выяўленьне: горад упрыгожаны, ілюмінаваны, як у радаснае сьвята.

Арганізавана, з чырвонымі сьцягамі зьявіўся на зборныя пункты бабруйскі пралетарыят, дэманструючы сваю гатоўнасьць да абароны савецкіх граніц. З яшчэ большым напружаньнем узяліся за работу тыя, хто застаўся ля варштату.

Не захапіла раптоўна спробная мабілізацыя і бабруйскую вёску.

— Калі-б гэта і ня спробная была, мы таксама зьявіліся-б поўнасьцю, — гавораць беднякі, середнякі і батрацтва.

ДУБРОЎСКІ.

Магілеў у дні спробнай мабілізацыі

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Першы дзень спробнай мабілізацыі прайшоў пры вялікім уздыме і арганізаванасьці працоўнага насельніцтва. Наш спэцкор набываў учора на радзе прыёмных пунктаў і ў горадзе, і ў ваколіцах. Усюды—узорны парадак, дысцыплінаванасьць і бадзёры настрой. Прызыўнікі добра разумеюць значэньне мабілізацыі і сьвядома выконваюць загады кіраўнікоў. Нідзе не заўважаецца выпадкаў п'янства і хуліганства. З мабілізаванымі вясковымі хлопцамі праведзены гутаркі па тэмы дня, кіраўнікі гутарак аднадушна заяўляюць, што сяляне, прыбыўшыя на пункты, праяўляюць сур'ёзныя і сьвядомыя адносіны да справы. «Мы прабуем зараз нашы сілы. Калі сапраўды надыдзе час мабілізацыі, мы таксама дружна зьявімся на пункты»—гаварылі многія вясковыя хлопцы.

Магілеў убраны сьцягамі, вечарам ва ўсім горадзе—урачыстая ілюмінацыя. Рух на вуліцах нябывалы. Доўгай істужкай цягнуцца фурманкі, арганізаванымі атрадамі ідуць мабілізаваныя, імчацца аўтамабілі і матацыклеты. Учора адбылася вялікая дэманстрацыя вучняў сямігодак. З плякатамі, прысьвечанымі спробнай мабілізацыі, школьнікі прышлі вітаць прызваных. Бурную сустрэчу наладзілі дзеці праходзіўшаму па вуліцы атраду мабілізаваных рабочых і закідалі яго кветкамі. Мясцовыя грамадзкія арганізацыі надзвычайна актыўна дапамагаюць мабілізацыі. Пры зборных пунктах арганізаваны агітпасты, забясьпечаныя літаратурай па пытаньнях міжнароднага становішча, індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Арганізаваны сталы даведак па розных пытаньнях і бюро скаргаў. Агітпункты забясьпечаны газэтамі, шахматамі і шашкамі. Для мабілізаваных наладжаны канцэрты і кіно-сэансы. Студэнцтва магілеўскіх тэхнікумаў праводзіць на пунктах вялікую агітацыйна-растлумачальную работу: наладжвае гутаркі і даклады на тэмы дня. Чырвоны Крыж наладзіў рад пунктаў першай дапамогі на зборных і здатачных пунктах. Вялікую работу праводзіць МЦРК. Ён алкрыў на пунктах ларкі і буфэты, якія бесьперабойна абслугоўваюць прызваных. Наогул, трэба прызнаць, што мясцовыя арганізацыі добра падрыхтаваліся да мабілізацыі і хутка прыстасавалі да ваенных патрэб увесь свой апарат. Учора ў горадзе на працягу кароткага часу пабывалі т.т. **Гамарнік, Галадзед і прадстаўнікі вышэйшага камандваньня.** Рад адказных працаўнікоў акругі выехаў на раёны для правядзеньня мабілізацыі.

Ня гледзячы на мабілізацыю, у горадзе кіпіць будзённая работа, заводы працуюць нармальным тэмпам, за горадам ідзе ўзмоцненая пабудова новых фабрык.

Тэмп падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі не парушаны ні на ёту. На сёньняшні дзень падпіска дасягнула 1 мільёна 200 тысяч рублёў—больш 100 проц. кантрольных лічбаў.

АЎГ. БУТОМАЎ.

ТЭЛЕГРАМА

Акругкому КП(б)Б, Акваенкамату, копія РВ Савету Беларускай Вайсковай Акругі

У першы дзень спробнай мабілізацыі члены саюзу Чэрыкаўшчыны, сабраўшыся для абгаварэньня яе задач і міжнароднага становішча, ухваляюць мерапрыемствы Савецкага Саюзу ў правядзеньні спробнай мабілізацыі для праверкі баявой падрыхтоўкі працоўных мас. Мы запэўняем партыйныя органы ў тым, што з боку працоўнага насельніцтва Чэрыкаўшчыны будзе стопроцантная яўка ў часе спробнай мабілізацыі.

Нашы ворагі — нэпманы ў горадзе, кулакі на вёсцы — жадаюць скарыстаць мабілізацыю, каб навесьці паніку, але ім гэта ня ўдасца. Члены прафсаюзаў бяруць на сябе абавязак растлумачыць насельніцтву сутнасьць спробнай мабілізацыі. Тэмп нашае работы не паменшыцца, а павялічыцца.

Няхай жыве ЎсеКП(б) — кіраўнік працоўных мас!

Няхай жыве Чырвоная армія — абаронца пралетарыяту!

ПРЭЗЫДЫУМ СХОДУ.

Ня вер правакацыйным чуткам клясавага ворага! Манэўры не вайна, а вучоба.

Кітайскія банды прасоўваюцца да нашае граніцы

Новыя арышты савецкіх грамадзян

Рух войска

У Харбін прыехаў кіраўнік мукдэнскай арміі генэрал Ван Сун-чан. Пасьля свайго назначэньня на пост камандуючага войскам, ён накіраваў эшалон з войскам па Паўднёва-Манчжурскай чыгунцы, а потым у Таонань, у Цыцыкарскі раён, а адтуль на фронт. Перасоўка войск з Мукдэна да нашых граніц ідзе ўзмоцненым тэмпам.

За апошнія два дні ў паласе чыгункі арыштаваны 215 савецкіх служачых, усе яны прызнаны небясьпечным элемэнтам і заключаны ў турму. Сем'ям арыштаваных запрапанавана ў трохгадзінны тэрмін аслабаніць кватэры. Сярод арыштаваных—машыністкі і рабочыя-чыгуначнікі, рабочыя, якія праслужылі на чыгунцы больш 20 год.

Белагвардзейскі зьлёт у Манчжурыі

ХАБАРАЎСК, 14. У мукдэнскіх і харбінскіх газэтах і ў афіцыйнай радыёзводцы паведамляецца: «Прыхільнікі старога царскага рэжыму арганізавалі ў Харбіне сакрэтнае таварыства супроць III-га Інтэрнацыяналу. Гэта новая белагвардзейская арганізацыя апублікавала бюлетэні, у якіх абвяшчала карную экспэдыцыю супроць савецкае ўлады».

У тых-жа газэтах паведамляецца, што з Парыжу праз Шанхай пачалі зьяжджацца белагвардзейскія афіцэры.

„Пазыка" паводле Чан Кай-шы

ТОКІЁ, 14. Чан Кай-шы рашыў правесьці разьмяшчэньне пазыкі на «патрэбы дэмабілізацыі арміі» ў прымусовым парадку. Чан Кай-шы разаслаў усім правінцыяльным урадам і грамадзкім арганізацыям тэлеграму—абежнік, у якой рэзка нападае на сваіх працаўнікаў. (ТАСС).

Нанкінскім дыплёматам і тут не пашанцавала

ВАШЫНГТОН, 13. Апублікавана нота нанкінскага ўраду, у якой апошні просіць ПАЗШ адмовіцца ад экстэрытарыяльнасьці амэрыканскіх грамадзян у Кітаі. Нота ў асьцярожных выразах нямякае на магчымасьць байкоту амэрыканскіх тавараў і, наогул, антыамэрыканскага руху ў Кітаі, калі толькі ПАЗШ не пачнуць перагаворы аб адмене экстэрытарыяльнасьці.

Далей зазначаецца, што кітайскі ўрад ня будзе ў стане саўладаць з выказам пачуцьцяў кітайскага народу супроць дзяржаў, якія працягваюць дамагацца экстэрытарыяльнасьці.

Нота нанкінскага ўраду зрабіла нядобрае ўражаньне ў Вашынгтоне. Дзяржаўны дэпартамант сустрэў ноту няпрыязна і, відавочна, не мяркуе пайсьці насустрэч просьбе нанкінскага ўраду склікаць безадкладна канфэрэнцыю для абмеркаваньня пытаньня аб адмене экстэрытарыяльнасьці. Праўдападобней усяго, дзяржаўны дэпартамант будзе спасылацца ў сваім адказе на нядаўнюю ноту Стымсона, у якой аналёгічная просьба нанкінскага ўраду была адхілена. (ТАСС).

СССР ПРАЯЎЛЯЕ ВЫКЛЮЧНУЮ ЦЯРПЛІВАСЬЦЬ

БЭРЛІН, 14. «Франкфуртэр Цайтунг» публікуе перадавую аб савецка-кітайскім канфлікце, пад загалоўкам: «Ваенная небясьпека і папярэджаньне вайны». Артыкул гэты зазначае: «У савецка-кітайскіх перагаворах аб мірным вырашэньні канфлікту Кітай займае такую пазыцыю, якая ў сапраўднасьці ня сьведчыць аб сумленным жаданьні да прымірэньня. Досыць толькі глянуць на абмен нотамі паміж абедзьвюма краінамі, каб пераканацца, што Кітай усімі сіламі імкнецца не дапусьціць аднаўленьня парушанага ім законнага статус-кво. Калі ідзе гутарка аб пагранічных сутычках, дык наогул вельмі цяжка ўстанавіць, хто зьяўляецца зачынышчыкам. Аднак, супроць Кітаю гаворадь дзьве рэчы: у кітайцаў у Мукдэне сядзіць Чжан-Сюэ-лян, годны сын свайго бацькі, якога, калі хочаш быць далікатным, можна назваць прайдохаю.

Апрача таго ў Кітаі знаходзіцца шмат белагвардзейцаў, якія натуральна скарыстаюць усякую магчымасьць для таго, каб справакаваць СССР і ўцягнуць яго ў сур'ёзную вайну. Паведамленьні, якія штодня атрымлівае сусьветны друк з Мукдэну, Шанхаю і Нанкіну, гаворадь аб савецкіх нападах на кітайскую тэрыторыю, тады як у сапраўднасьці справа заключаецца ў адбіцьці кітайскіх нападаў і ў пакараньні кітайцаў за гэтыя напады. Савецкае камандваньне да гэтага часу сапраўды было вельмі цярплівым.

Рашучы адпор кітайскім белабандытам

Наш карэспандэнт гутарыў з прадстаўнікамі Рэвваенсавету СССР, якія прыехалі з савецка-кітайскай граніцы, аб апошніх падзеях, якія мелі месца ў раёне ст. Пагранічная.

Непарыўная бандыцкая дзейнасьць белагвардзейцаў і няспыненыя выпады кітайскіх часьцей супроць нашых пастоў, часты пераход граніцы, забойства і грабяжы мірных жыхароў—усё гэта прымусіла наша камандваньне даць сур'ёзны прадметны ўрок кітайскай ваеншчыне.

Урок гэты быў кароткі, але вельмі выразны. Ён стварыў у кітайскіх мілітарысцкіх колах апаламляючае ўражаньне і паніку. Кітайская ваеншчына пачула, што з Чырвонай арміяй, з нашымі паветранымі сіламі нельга жартаваць, што яны не пацерпяць наглых нападаў.

На чыгуначным вучастку К.-Усх. ч. Мулін-Пагранічная спыніўся рух. Увесь гэты раён эвакуяваны. Кітайскія часьці разьбягаюцца.

Трэба яшчэ раз з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што адпор Чырвонай арміі насіў чыста-абарончы характар і меў сваёй мэтай спыніць агрэсыўную дзейнасьць кітайскай ваеншчыны і бандытаў-белагвардзейцаў.

ПАДЗЕІ У АЎГАНІСТАНЕ

Посьпехі Надыр-Хана

ЛЁНДАН, 19. Тубыльныя аўганскія войскі, якія, як лічаць, дзейнічаюць за адно з былым ваенным міністрам Надыр-Ханам супроць Хабібулы, занялі без бою горад Кандагар. (ТАСС).

СССР у барацьбе за абарону савецкіх грамадзян у Манчжурыі

Абмен нотамі паміж СССР і Нямеччынай

6 верасьня нарком замежных спраў СССР перадаў нямецкаму пасольству ў Маскве ноту з поваду становішча савецкіх грамадзян у Манчжурыі (паўночная частка Кітая, праз якую праходзіць К.-Усх. чыг.). Пры разрыве адносін паміж СССР і Кітаем нямецкі ўрад, як вядома, згадзіўся ўзяць на сябе абарону інтарэсаў савецкіх грамадзян у Кітаі. У адпаведнасьці з гэтым нарком замежных спраў зварачае ўвагу нямецкага ўраду на дзікае цкаваньне савецкіх грамадзян у Манчжурыі, на зьверствы в боку манчжурскае ўлады, і нарэшце выказваў надзею, што **«нямецкі ўрад зараз-жа ўжыве ўсе патрэбныя меры дзеля таго, каб быў магчыма хутчэй пакладзены канец тым бесчалавечным актам (учынкам), якія так шырока ўжываюць кітайскі ўрад і кітайскія ўлады».**

Адначасова нота паказвала, што бязупынныя арышты, зьдзекі і забойствы савецкіх грамадзян у Манчжурыі прымушаюць «рабіць вывад, што меры аховы, якія ўжываліся да гэтага часу нямецкімі консуламі ў Кітаі, **ня здолелі прывесьці да колькі-небудзь значных вынікаў».**

НЯМЕЦКАЯ НОТА

9 верасьня нямецкае пасольства ў Маскве адказала, што асноўны зьмест савецкай ноты быў зараз-жа пратэлеграфаваны нямецкаму пасольству ў Кітаі «для далейшых мер». Далей, нямецкая нота просіць урад СССР «для больш сапраўднай абароны» савецкіх грамадзян у Манчжурыі дапоўніць весткі аб пакараньнях сьмерцю савецкіх грамадзян, зьнікненьнях многіх асоб і знахаджэньня трупаў без галоў шляхам паведамленьня ўсіх падрабязнасьцяй, асабліва па магчымасьці імёнаў зьнікшых асоб. У той-жа час у нямецкай ноце зазначаецца, што «нямецкі ўрад в вялікім зьдзіўленьнем даведаўся аб нападках, што былі ў ноце савецкага ўраду і накіраваных супроць дзейнасьці нямецкіх консулаў па ажыцьцяўленьні абароны савецкіх грамадзян».

НОВАЯ НОТА СССР

13 верасьня нарком замежных спраў СССР перадаў нямецкаму пасольству ў Маскве новую ноту, у якой гаворыцца: «Народны камісарыят **ня можа згадзіцца з цьверджаньнем ноты нямецкага пасольства, нібы нота народнага камісарыяту ад 6 верасьня мае ў сабе нападкі на дзейнасьць нямецкіх консулаў у Кітаі.** Паказаная нота мела сваёй задачай зьвярнуць увагу нямецкага ўраду на выключна цяжкае становішча савецкіх грамадзян у Манчжурыі, якія падлягаюць нячуваным зьдзекам і гвалтам з боку кітайскіх улад. Разам з тым Народны Камісарыят лічыў неабходным зьвярнуць увагу нямецкага пасольства **на невыстарчальна эфэктыўныя, ня досыць плённыя вынікі дзейнасьці нямецкага консула ў Харбіне** па абароне штодзённых інтарэсаў савецкіх грамадзян». У адказ на просьбу аб дапаўненьні вестак з поваду гвалтаў і зьверстваў над савецкімі грамадзянамі ў Манчжурыі, нарком замежных спраў далучае да сваёй ноты дзьве зводкі. Падаем тут некаторыя, найбольш важныя факты з гэтых зводак.

З першай зводкі

23 жніўня. На ст. Джалайнор арыштаваны савецкія служачыя Даньнікаў і Кудзінаў. Кітайскія ўлады прад'явілі ім абвінавачаньне «ў псаваньні тэлефонных правадоў».

Абодва арыштаваныя загінулі нямаведама куды. Ёсьць меркаваньні, што яны пакараны сьмерцю.

24 жніўня. З Токіё паведамляюць, што на раца Сунгары і на ст. Бухэду знойдзена 6 трупаў з адрэзанымі галавамі. Некаторыя з іх пазнаны і аказаліся савецкімі грамадзянамі.

24 жніўня. Паводле паведамленьняў японскага агэнцтва «Дэмпо Цусін», у Хайлары пакараны сьмерцю чэцьвера савецкіх грамадзян.

З другой зводкі

1. У галоўным штабе ў Харбіне, куды накіроўваюць усіх савецкіх грамадзян па абвінавачаньні «ў шкодніцтве», **шырока ўжываюць катаваньні, лупцаваньні, збойствы.**

Ёсьць пісьмовыя матар'ялы, якія пацьвярджаюць гэтыя факты.

2. У Бухэду была арыштавана тэлеграфістка—савецкая грамадзянка за пасылку тэлеграмы нямецкаму консулу з поваду збойства арыштаваных савецкіх грамадзян.

3. Трупы савецкіх грамадзян без галоў знаходзяцца **амаль штодня** ў раёне Харбіна і на лініі К.-Ус. чыг.

У Харбіне ёсьць фатаграфічныя здымкі з гэтых трупаў.

Чырвоная армія—узброены баявы атрад працоўных усіх нацыянальнасьцяй

Адкрылася маскоўская аблпартканфэрэнцыя

У суботу вечарам у перапоўненай калённай залі Дому Саюзаў адкрылася першая Маскоўская абласная партканфэрэнцыя. На канфэрэнцыі прымае ўдзел 1.000 дэлегатаў, якія зьяўляюцца прадстаўнікам, акрамя Масквы, Тульскае, Цьвярское, Разанскае, Калускае, Кімрскае і іншых округ толькі што сфармаванае вобласьці.

Канфэрэнцыю адкрыў сакратар МК і аргбюро т. **Бауман.**

ВЫБАРЫ КІРАЎНІЧЫХ ОРГАНАЎ КАНФЭРЭНЦЫІ

У прэзыдыум канфэрэнцыі абрана 89 чалавек. У ліку членаў прэзыдыуму наступныя т. т.: **Бауман, Бубноў, Мянжынскі** (АДПУ), **Молатаў, Папонскі** (МК), **Уншліхт, Уханаў, Яраслаўскі** і інш.

У ганаровы прэзыдыум пры бурных аплёдысмэнтах абраны т. т. **Сталін, Молатаў, Калінін, Рыкаў, Варашылаў, Рудзутак, Куйбышаў, Кагановіч, Арджанікідзе, Тэльман і Крупская.**

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ тав. ЯРАСЛАЎСКАГА

МАСКВА, 16. Маскоўская абласная партканфэрэнцыя пастанавіла паслаць прывітаньне т. Сталіну 15-га верасьня на канфэрэнцыі выступіў тав. Яраслаўскі, які прысьвяціў сваю прамову чысткі партыі.

— За апошні час—кажа ён—партарганізацыі аслабілі ўвагу на гэтым пытаньні. Прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі крыху стаяць у баку. Некаторыя арганізацыі аднесьліся вельмі нядбайна да падбору складу праверачных камісіяў. Дзе-нідзе пасылалі ў праверачныя камісіі менш занятых, ня ўлічваючы, ці можа таварыш оправіцца з такой адказнай работай. Адсюль памылкі, якія дапусьцілі некаторыя праверачныя камісіі. Тав. Яраслаўскі прыводзіць некалькі прыкладаў. Да камандзіра дывізіі, заслужанага байца, прыставалі з пытаньнем, да якіх жанчын ён залягаецца. Некаторыя камісіі вучонымі пытаньнямі (ці ёсьць у нас дыфэрэнцыяльная рэнта, што такое дэвальвацыя і т. д.) адцяжваць рабочых — членаў партыі. Ня дзіва, напрыклад, што ў Івана-Вазьнясенску ў час чысткі адбыўся вялікі адсеў за кошт добраахвотна выхшаўшых з партыі. Асобныя факты сьведчаць, што прыцягненьню ў партыю рабочых ад варштату многія не ўдзяляюць сур'ёзнае ўвагі, бо адносяцца фармальна. Чыстку трэба рабіць так, каб ніхто не баяўся гаварыць ад недахопах членаў партыі, каб партыйная і беспартыйная маса сьмела крытыкавала работу асобных таварышоў. Ніхай кожны камуністы падумае над тым, што рабіў ён для вярбоўкі ў партыю рабочых ад варштату. (ТАСС).

Ад'езд польскай рабоча-сялянскай дэлегацыі з Менску

ПРОВАДЫ ДЭЛЕГАЦЫІ

15-га верасьня менскія рабочыя праваджалі дэлегацыю рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, якая гасьціла ў Беларусі некалькі дзён.

У Доме Культуры адбыўся вялікі рабочы мітынг. Ад імя ЦСПСБ мітынг адкрыў т. **Клімковіч.**

Першым выступіў з прывітаньнем прадстаўнік фрунзаўскай раённай канфэрэнцыі МОПР'у **т. Бэрнацкі,** які прасіў дэлегацыю перадаць зарубежным братом, што МОПР дапамагаў і заўсёды будзе дапамагаць палітзьняволеным капіталістычных турам.

Старшыня польскай рабочай дэлегацыі **т. Мац падзяліўся** ўражаньнямі аб паездцы на СССР.

— Мы, кажа **т. Мац,** не спадзяваліся ўбачыць такі вялікі размах будаўніцтва. Нам гаварылі, што ў СССР усё разбурана, што быццам інтэлігенцыя адыйшла ад рабочае клясы і не дапамагае ёй у сацыялістычным будаўніцтве і г. д. Гэта няверна. Рабочыя, прафэсары, інжынэры працуюць усе разам пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

— Мы ведаем, што буржуазія рыхтуе вайну супроць СССР. Але, калі стрэльбы пападуць у нашы рукі, дык мы іх накіруем супроць самой буржуазіі.

Ад імя дэлегацыі выступалі яшчэ т. т. **Кавальчук, Гутэрман, Бэм і інш.**

Усе яны адзначалі вялікія дасягненьні рабочае клясы СССР у гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

— **У вас, кажа дэлегат, селянін Заходняй Беларусі т. Кавальчук, ёсьць ВНУ, акадэмія навук і цэлы рад іншых навуковых устаноў—усё для працоўных. У Заходняй-жа Беларусі няма нават і першапачатковых школ.**

Усе дэлегаты адзінадушна зазначалі на правільнае вырашэньне ў СССР нацыянальнага пытаньня.

Гучнымі воплескамі было спаткана вьяўленьне ў залі дэлегатаў ад рабочых і сялян Аргэнтыны—таварышоў **Шлейфэра і Лукавіцкага.** Іх запрасілі ў прэзыдыум.

Тав. **Шлейфэр** перадаў прывітаньне польскай дэлегацыі і працоўным Беларусі ад рабочых і сялян Паўднёвай Амэрыкі.

— Мы, кажа тав. **Шлейфэр,** знаходзімся ў СССР ужо два месяцы. Нам даручылі вывучыць тое цуда, якое працоўныя зрабілі ў СССР.

Мы ўбачылі дасягненьні і недахопы. Рабочая кляса ўсяго сьвету гатова дапамагчы працоўным СССР зьнішчыць гэтыя недахопы.

Рабочыя Аргэнтыны не дазволяць вывезьці ніводнага кілё мяса, ніводнага кілё пшаніцы для імпэрыялізму, які рыхтуе напад на СССР.

— Мы будзем змагацца за тое, каб сьцяг Саветаў разьвіваўся ва ўсім сьвеце.

З адказам выступалі прадстаўнікі менскіх рабочых—мэталіст тав. **Казлоў,** чыгуначнік—т. **Галаскок** і старшыня ЦСПСБ —т. **Рыжоў.**

Сьнеўам «Інтэрнацыянала» мітынг закрыўся.

Учора ўвечары польская дэлегацыя выехала з Менску.

ЛІСТ ТАВ. ЛАНЦУЦКАГА ДА РАБОЧЫХ ЛЕНІНГРАДУ

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Вы, як авангард расійскае рэвалюцыі, выканалі гістарычную справу, разьбіваючы дашчэнту на вялікім расійскім фронце жалезны абруч сусьветнага імпэрыялізму. Бальшавіцкая партыя пад кіраўніцтвам Леніна пасьля расправы з урадам рускіх капіталістых і абшарнікаў, не магла яшчэ прыступіць да спакойнае работы на карысьць добрабыту краю. Заходня-эўрапэйскія імпэрыялістыя супольна з панскаю Польшчаю распачалі новыя войны, аднак, пралетарыят былое царскае імпэрыі разьбіў і гэтыя намаганьні міжнароднае контрэвалюцыі. З гэтай барацьбы вы вышлі пераможцамі, вораг уцёк з вашае зямлі, але ўсё-ж ён ня думае аб капітуляцыі перад пераможнаю расійскаю рэвалюцыяй. Час перадышкі ён выкарыстоўвае на новую падрыхтоўку да вайны. Дзень і ноч працуюць генэральныя штабы імпэрыялістычных дзяржаў, дзень і ноч працуюць фабрыкі прылад зьнішчэньня.

У той час, калі капіталістычны сьвет разбудоўвае сваю вытворчасьць для мэт вайны і эксплёатацыі, вы разбудоўваеце яе з мэтай ажыцьцяўленьня сацыялізму. Як толькі мы пераступілі межы фашысцкае Польшчы і апынуліся на зямлі вольнага СССР, адразу-ж заўважылі гэтую розьніцу. У вас вырастае лес новых фабрычных камінаў розных галін промыслу і ў вас вырастаюць новыя вежы, але не касьцёльныя, як у фашысцкай Польшчы, але сьвідравальныя вежы для здабычы нафты. У вас растуць магутныя гіганты гідра-электрычных станцый, энэргія якіх прывядзе ў рух муравейнік фабрычных машын, а разам з тым ёю будзеце нішчыць на вёсцы цэркву—праклятую памяць царскага гаспадараньня.

У вас паўстаюць новыя калёніі рабочых дамоў, павярхоўны выгляд якіх павінен будзіць зайздрасьць, але разам і радасьць у душах нашых дэлегатаў, якія жывуць у сутарэньнях, скляпох і норах фашысцкае Польшчы. Бо ў вас дамы-адпачынку, санаторыі, прафілякторыі, дзіцячыя ясьлі, сады, паркі — усё гэта для братоў нашых, работнікаў і сялян СССР. У Польшчы фашысцкі ўрад будуе для рабочых таксама дамы — але гэта турмы, у якіх гніюць цэлымі гадамі найлепшыя сыны рабочае клясы за падняцьце штандару барацьбы супроць свайго сьмяротнага ворага — буржуазіі. У вас зьнікаюць калектыўныя сялянскія гаспадаркі і магутныя саўгасы як «Гігант» за Растовым, які мы аглядалі. 127.000 гэкт. цаліны стэпу ў гэтым годзе далі пралетарскай дзяржаве свой першы ўраджай. Гэтакіх «гігантаў» будзе што раз больш.

У вас савецкі ўрад звольніў ад падатку 35 проц. сялян-беднякоў, у Польшчы-ж урад фашыстых таксама звольніў ад маемаснага падатку, але—абшарнікаў. У вас савецкі ўрад ідзе з дапамогаю селяніну бедняку і середняку палёгкамі ў набыцьці земляробчых машын, добрага насеньня і г. д., і ў Польшчы фашысцкі ўрад дапамагае, але абшарнікам і кулаком, палёгкаю атрыманьня патрэбных крэдытаў для яшчэ большага ўціску сялянскае беднаты і батракоў. Пра атрыманьне-ж зямлі ў Польшчы пры сучасных буржуазных і згодніцкіх урадах сялянству нават і марыць нельга.

У вас рабочыя маюць вельмі добрае сацыяльнае законадаўства, у Польшчы-ж фашысцкі ўрад адбірае ад рабочых і тыя мізэрныя дасягненьні, якія пралетарыят здабыў у 18-19 гадох. У вас на фабрыцы рабочыя маюць сваіх вылучэнцаў — чырвоных дырэктароў, якія супольна з фабрычным камітэтам кіруюць аграмаджанаю прадукцыяй. У Польшчы-ж дырэктары--гэта ўсемагутныя паны, да якіх рабочы ня мае доступу. У вас рабочы і селянін дармова вучацца, адна толькі яго здольнасьць вырашае магчымасьць паступленьня яго ў любую школу, у Польшчы-ж сярэднае і вышэйшае навучаньне для рабочага і селяніна зачынена на сем пячатак.

У вас кожная тэрытарыяльная нацыянальнасьць мае ўласную нацыянальную дзяржаву, **А МЕНШАСЬЦІ КАРЫСТАЮЦЦА ПОЎНАЮ НАЦЫЯНАЛЬНАЮ СВАБОДАЮ,** у Польшчы нацыянальныя меншасьці, якія на сваіх землях складаюць большасьць, дэнацыяналізуюцца праз зьнішчэньне іх нацыянальных школ, забарону іх мовы ва ўстановах, а таксама прымушаньнем дзяцей вывучаць польскую мову ў школах. Адсюль ня дзіва, што рабочы і селянін прывязаны да свае савецкае ўлады, ён ведае, што гэта яго ўлада, яго ўрад і яго дзяржава. Аб гэтым таксама пераканаліся нашыя дэлегаты і цяпер разумеюць, чаму савецкія рабочыя з такім творчым энтузіязмам і запалам аддаюць усе свае сілы дзяржаве, прамысловасьці і земляробству.

Дэлегаты нашыя ў часе наведваньня СССР пераканаліся, што ўсё тое, што пісала буржуазная і сацыял-фашысцкая прэса з пэнэсэўскім «Роботнікам» на чале пра саветы, зьяўляецца подлаю і нікчэмнаю хлусьнёй, выдуманай для таго, каб ашукаць работніка і селяніна, каб выклікаць у яго варожы настрой супроць адзінае ў сьвеце рабочае дзяржавы, каб яго падрыхтаваць да вайны супроць адзінае сацыялістычнае бацькаўшчыны ўсіх рабочых усяго сьвету — СССР. Усё, што мы бачылі ў СССР, захвочвае нас да далейшае, ужо апошняе барацьбы з буржуазіяй і яе паслугачом—з сацыял-фашызмам за дыктатуру пралетарыяту ў Польшчы.

Таварышы, рабочыя Ленінграду! Прабываньне дэлегацыі рабочых і сялян Польшчы ў СССР павялічыла і замацавала вузлы салідарнасьці і братэрства паміж пралетарыятам абодвых краёў. Ніхай фашысцкая Польшча вострыць свае зубы і кіпцюры супроць СССР, ніхай узбройваецца—але прыдзе момант, калі рабочая кляса і сялянская беднота Польшчы супольна з пралетарыятам і бяднейшым сялянствам Зах. Украіны і Зах. Беларусі пад кіраўніцтвам КПП і Камінтэрну кінуцца ў барацьбу супроць ненавіснае польскае буржуазіі і абшарніцтва, і зброяй, якая падрыхтавана буржуазіяй, разаб'е гэты фарпост капіталізму і імпэрыялізму. Паставім усё на карту, не адступім ні перад якімі стратамі, будзем бязьлітаснымі да ворагаў нашых, бо ўсякае хістаньне і слабасьць зьявіліся-б здрадаю, якая можа загубіць перамогу рэвалюцыі.

Ніхай жыве і мацнее міжнародная салідарнасьць рабочых і сялян!

Прэч з фашызмам, сацыял-фашызмам і імпэрыялізмам, якія падрыхтоўваюць вайну супроць СССР!

Ніхай жыве польскі Кастрычнік!

Ніхай жыве міжнародная пралетарская рэвалюцыя!

Ніхай жыве магутны росквіт сацыялістычнага будаўніцтва!

Ніхай жыве СССР — бацькаўшчына рабочых і сялян усяго сьвету!

Ніхай жыве Камінтэрн — кіраўнік сусьветнай рэвалюцыі!

Ст. ЛАНЦУЦКІ.

Кіеў, 8 верасьня 29 г.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Пажар у фабрыцы самалётаў

ВАРШАВА, 13. У Лавіцы (пад Пазнаньню) згарэла фабрыка самалётаў. Згарэла 26 самалётаў, 16 матораў, мантажны інструмэнтальны і лякіравальны аддзелы. Агульныя страты дасягаюць паўтара мільёна злотых («Роб.»).

Забастовачны рух

Ад 24-га верасьня пягнецца забастоўка ў фальварках Залесьсе і Дэмбова Гура, Скверневіцкага павету. Прычына забастоўкі—нявыплачваньне абшарнікам зарплаты ў працягу трох месяцаў і наогул вельмі нізкія стаўкі. Надзвычайная арбітражная камісія цалкам пайшла на лініі абшарнікаў. Бастуючыя высоўваюць патрабаваньне аб пераглядзе ставак.

(«Роб.» 255).

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў ДАМБРОЎСКІМ БАСЭЙНЕ

ВАРШАВА, 14. У Дамброўскім каменна-вугальным басэйне паліцыя арганізавала ў мінулую ноч масавую аблаву і вобыскі, каб злавіць камуністых і камсамольцаў. У выніку аблавы арыштавана 33 чалавека. (ТАСС).

АРЫШТЫ УКРАІНЦАЎ У ЛЬВОВЕ

ВАРШАВА, 14. Як паведамляюць некаторыя газэты, Львоўская паліцыя арыштавала ўсіх удзельнікаў тэрарыстычных замахаў у дзень адкрыцьця львоўскага кірмашу. Усяго арыштавана 12 чалвек. Паводле вестак газэт, паліцыі ўдалося дакладна ўстанавіць, што ўсе ўдзельнікі замаху зьяўляюцца членамі украінскай ваеннай арганізацыі. (ТАСС).

На кожнага прызыўніка ўскладаецца абавязак узмацніць баяздольнасьць Чырвонай армії

Не дапусьціць пралезьці ў армію кулакоў і нэпманаў

Адозва д апрызыўнікоў 1907 году

ТАВАРЫШЫ ПРЫЗЫЎНІКІ!

Рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу добра памятаюць гэраічную барацьбу пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі за ўтрыманьне заваяваньняў Кастрычніка, гэраічныя перамогі над наймітамі расейскіх і сусьветных капіталістых і абшарнікаў.

Ужо 9 год прайшло з часу сканчэньня грамадзянскай вайны, з часу пераходу на мірнае будаўніцтва. За гэты час працоўныя Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам Ленінскай Камуністычнай партыі, дабіліся вялізарных посьпехаў у гаспадарчым будаўніцтве. За 9 год мірнае работы, упартасьцю рабочае клясы, батрацтва, бядняцка - серадняцкае масы ў адсталай Расіі вырасьлі буйныя сацыялістычныя прадпрыемствы, растуць саўгасы, буйныя калгасы. Працоўныя, пакончыўшы з узброеным ворагам, будуюць новае жыцьцё, стваральнае новае сацыялістычнае грамадзтва.

Наша пасьляховае сацыялістычнае будаўніцтва выклікае шалёнае супраціўленьне кулака ў вёсцы, нэпмана ў горадзе. Яны імкнуцца ўсімі сіламі перашкодзіць, дзе агнём, а дзе забойствамі камуністых, лепшых прадстаўнікоў савецкае ўлады, каб сарваць наш рост. Кулак, нэпман разам з сусьветнай буржуазіяй блёкуюцца, каб утварыць адзіны фронт супроць Савецкага Саюзу — бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту.

Таварышы прызыўнікі! Памятайце, што барацьба яшчэ ня скончана. Сусьветныя драпежнікі—капіталістыя, выкінутыя ўзброенымі працоўнымі масамі за межы Савецкага Саюзу, не супакоіліся. Капіталістычнае акружэньне, ня гледзячы на нашу мірную палітыку, увесь час нам пагражае ваеннай небясьпекай: капіталістыя не пакінулі думкі вярнуць багацейшыя абшары Савецкага Саюзу і зрабіць іх сваёй калёніяй. З другога боку, капіталістыя гатовы задушыць Савецкі Саюз і таму, што прыклад яго рэвалюцыянізуе рабочых, сялян капіталістычных краін, не дае магчымасьці яшчэ больш павялічыць эксплёатацыю, як-бы ім хацелася. Гэтым тлумачыцца рад правакацый з боку капіталістычных краін у адносінах Савецкага Саюзу. Апошнія падзеі на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы яскрава сьведчаць аб драпежніцкіх імкненьнях капіталістых задушыць Савецкі Саюз, аб павялічэньні небясьпекі вайны супроць СССР.

Рабоча-сялянская Чырвоная армія — армія, якая гэраічна адбіла напад капіталістых у часе грамадзянскай вайны, цьвёрда стаіць на варце мірнага сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу.

Працоўныя ўсяго сьвету дапамаглі і дапамагаюць Савецкаму Саюзу ў ажыцьцяўленьні вялікага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, рост Савецкага Саюзу жадаюць міра будаваць сацыялізм, але, жадаючы міру, мы павінны быць гатовымі да адпору нападу на нас. Лепшая гарантыя міру — гэта шпаркім тэмпам рухацца да сацыялізму, шляхам набудовы новых фабрык, заводаў, мабілізацыі ўнутраных сродкаў, 100 процантнай рэалізацыі 3-й пяцігодкі індустрыялізацыі, арганізацыі новых буйных калгасаў, уцягваючы ў іх бядняцка-серадняцкія масы сялянства, рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і асабліва вёскі (нэпмана, кулака), узмацненьня абароназдольнасьці краіны і баяздольнасьці Чырвонай армії.

Таварышы прызыўнікі! Служыць у Чырвонай армії — гэта ганаровы абавязак, абавязак, даступны толькі працоўным.

Памятайце, што, накіроўваючы вас у Чырвоную армію, рабочыя і працоўнае сялянства ўскладаюць на кожнага прызыўніка абавязак узмацніць баяздольнасьць армії і гэтым забясьпечыць абароназдольнасьць краіны супроць звароту абшарніцкага і капіталістычнага гнёту.

Таварышы прызыўнікі! Краіна патрабуе ад вас сьвядомых адносін да прызыву.

Сваячасовай і поўнай яўкі на прызыўны пункт.

Не дапускаць пралезьці ў армію кулакоў і нэпманаў.

Даць адпор усялякім плёткам клясавага ворага і контр - рэвалюцыйным чуткам, якія распаўсюджваюцца.

Ніхай жыве Чырвоная армія — вартаўнік мірнага будаўніцтва працоўных!

Ніхай жыве новае папаўненьне Чырвонай армії — прызыўнік 1907 году!

Ніхай жыве Камуністычная партыя—кіраўнік Чырвонай армії!

Менскі Акруговы Камітэт Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі.

Менскі Акруговы Выканаўчы Камітэт Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў.

Цэнтральны Савет Прафэсыянальных Саюзаў Беларусі.

Акруговы Камітэт Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі.

Пералому ў хлебазагатоўках яшчэ няма

Дырэктывы партыі аб хлебазагатоўках на мясцох не ўсьвядомлены і ня выконваюцца. Сялянскі хлеб паступае спава, аграмаджаны сэктар устрымліваецца пакуль што ад здачы, а загатоўчыя і мясцовыя арганізацыі маўчаць і нічога ня робяць. —Трэба неадкладна ціснуць на ўсе вагары і зьні шчыць усе выкрытыя недахваты з тым, каб верасьнёўскі плян быў выкананы ў поўным аб'ёме

Выкананьне пляну хлебазагатовак за ліпень-жнівень характарызуецца наступнымі данымі: памольнага збору паступіла 7.030 тон (145 проц. выкананьня пляну), ад сялян паступіла 1.215 тон (48 проц. выкананьня пляну).

Гэтыя першыя даныя аб ходзе першапачатковых загатовак зноў паўтараюць сумныя зьявішчы леташняй загатоўчай кампаніі, калі загатоўкі ішлі за кошт абавязковых паступленьняў, а не за кошт разгортваньня сялянскіх загатовак.

І яшчэ адно — зусім амаль адсутнічае здача хлеба саўгасамі, калгасамі і кантрактантамі, а ў 3-й дзесяцідзёўцы жніўня гэтыя паказальнікі павінны фігураваць на першым месцы.

Трэба разварушыць хлебазагатоўчыя арганізацыі, якія, як відаць, чакаюць штурмкоў з цэнтру. З першых-жа дзён трэба зьнішчыць гэтыя фармальныя, казённыя адносіны з боку аграмаджанага сэктару нашае сельскае гаспадаркі.

У галіне сялянскіх хлебазагатовак ні адна з загатоўчых арганізацый ня выканала поўнасьцю плянавага заданьня і, як відаць, досыць цьвёрда не рэагавала на гэта невыкананьне. Зусім недапушчальна каб з першых-жа часоў парушалася дысцыпліна ў радох загатоўшчыкаў. Расхлябанасьці не павінна быць месца ў надышоўшай хлебазагатоўчай кампаніі. Тэрміны выкананьня павінны быць строга захаваны.

Акруговыя інспэктары гандлю, як відаць, сваячасова не сыгналізуюць перад мясцовымі савецкімі і партыйнымі органамі невыкананьне плянаў. Адчуваецца поўны спакой з боку ўсіх органаў у адносінах да зародку гэтага грознага зьявішча.

Калі ў поўнай меры немагчыма націскаць на паўночныя округі, то трэба патрабаваць выкананьня заданьня ад паўднёвых збожжавых округ, дзе ўборка хлеба разгарнулася з першых лічбаў жніўня.

Абмалот распачаўся,—аб гэтым сьведчаць лічбы паступленьня памольнага збору. Трэба ад слоў перайсьці да справы. Грош цана ўсім заявам аб праробленай падрыхтоўчай рабоце, калі гэта работа не дае належнага эфэкту. Партыйныя і савецкія органы кожнай округі павінны зараз-жа праверыць, як выконваюцца дырэктывы і намечаныя мерапрыемствы, трэба прыцягнуць да адказнасьці асоб, што зрываюць хлебазагатоўчую работу ў самым пачатку. Улічваючы, што верасьнёўскі плян шмат перавышае пляны мінулых год, трэба націснуць на ўсе вагары і патрабаваць ад загатоўшчыкаў выкананьня намечанага верасьнёўскага пляну.

Побач з вышэйазначаным, трэба завастрыць увагу на зьнішчэньне наступных нездаровых зьявішч.

Спажывецкая каапэрацыя (Менскае аддзяленьне БКС не давяла выданай Наркамгандлем інструкцыі па вядзеньні хлебазагатовак да нізоўкі, матывуючы гэта тым, што аб парадку загатовак шмат гаварылася на вытворчай нарадзе з пізавымі каапэрацыйнымі работнікамі.

Невыстарчальна растлумачана пізавым чэйкам парадак прэміраваньня здатчыкаў хлеба прамтаварамі. Таварышы, што выступалі на нарадзе менскага прыгараднага спажывецкага таварыства, выказваліся за першачарговасьць прэміраваньня здатчыкаў хлеба — пайшчыкаў спажывецкай каапэрацыі, а ўжо потым рэшты здатчыкаў.

Гэта зусім няправільна. Леташняму бясчынству з прэміраваньнем трэба паклаасьці канец. Прэміраваца павінны ў аднолькавай меры ўсе здатчыкі хлеба, незалежна ад таго, куды здаюць хлеб і дзе зьяўляюцца пайшчыкамі. Справаю ўрэгуляваньня прэміраваньня павінны заняцца сельскія саветы і камісіі па дапамозе хлебазагатоўкам.

Паводле паведамленьняў Аршанскага інспэктара гандлю, у Воршы на загатоўчым пункце саюзхлеба зусім не аказалася пурак (прылада для вызначэньня якасьці збожжа). Адсутнасьць пурак не дае магчымасьці заахвочваць сялян да здачы збожжа лепшае якасьці, а прыём на вока выклікае рад нараканьняў з боку здатчыкаў.

Адзначаюцца моманты невыстарчальнага забесьпячэньня загатоўчых пунктаў тарай (Днепрасаюз, Магілеў).

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што асноўныя дырэктывы, даныя партыйнымі і савецкімі органамі, ня досыць усвоены як загатоўчымі арганізацыямі, так і мясцовымі органамі, і падрыхтоўчая работа праведзена слаба.

Асноўнай задачай таварышоў, што выехалі на месцы, зьяўляецца — зьнішчыць усе недахваты, аб усіх зьявішчах, што падрываюць мерапрыемствы партыі, неадкладна давесьці да ведама акруговых органаў і накіраваць работу так, каб верасьнёўскі плян быў выкананы цалкам.

САКАЛОЎ.

Ніводнага партыйца без „Зьвязды"

Кастрычнікаўская арганізацыя КП(б)Б выклікае на спаборніцтва Віцебскую гарадзкую партарганізацыю

13-га верасьня адбылася нарада сакратароў ячэек КП(б)Б, рэдкалегій насьценгазэт і камсамольскага актыву Кастрычнікаўскага раёну, на якой, побач з іншымі пытаньнямі, абмяркоўвалася пастанова бюро райкому аб падпісцы на газэту «Зьвязда». Нарада ўхваліла пастанову бюро РК і пастанавіла зараз-жа шырока абмеркаваць пытаньне падпіскі на сходах партячэек, высунуўшы лёзунг «ніводнага партыйца без «Зьвязды».

Адначасова, в гэтым, нарада лічыць неабходным мабілізаваць усіх партыйцаў для растлумачальнай работы сярод беспартыйных аб падпісцы на «Зьвязду».

Для таго, каб гэтая работа дала лепшыя вынікі, нарада пастанавіла ўсю работу праводзіць шляхам спаборніцтва паміж асобнымі ячэйкамі. Райкомам партыі выпушчана адозва, якая заклікае ўсіх партыйцаў прыняць належныя заходы да распаўсюджаньня газэты, да растлумачэньня яе ролі і значэньня для кожнага партыйца і беспартыйнага рабочага.

Кастрычнікаўская партарганізацыя выклікае на спаборніцтва па падпісцы на «Зьвязду» Віцебскую гарадзкую партарганізацыю.

***

Койданаўскі райком КП(б)Б выклікае на спаборніцтва па падпісцы на газ. „Зьвязда" Барысаўскую партарганізацыю

Пашыраны пленум Койданаўскага райкому КП(б)Б пастанавіў на працягу двух тыдняў усім партячэйкам падпісацца на газэту «Зьвязда» і выклікае на спаборніцтва Барысаўскую раённую партарганізацыю.

Арганізуем спаборніцтва паміж цэх'ячэйкамі на лепшае распаўсюджаньне газэты

(Парткалектыў ст. Полацак)

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). На пасяджэньні бюро партыйнага калектыву ст. Полацак была заслухана інфармацыя сакратара калектыву тав. **Гушчы** аб падпісцы на ЦО КП(б)Б—газэту «Зьвязда» ў зьвязку з выклікам парткалектыву Добрускай фабрыкі «Герой працы».

Высьветлілася, што з звыш 200 камуністых, аб'яднаных 5-ю цэх'ячэйкамі на ст. Полацак «Зьвязду» выпісваюць толькі каля 15 чалавек.

Бюро парткалектыву вынесла пастанову, у якой адзначае неабходнасьць дабіцца рашучага пералому у справе распаўсюджаньня «Зьвязды».

Як першае пачынаньне, бюро парткалектыву ў ліку 14 чалавек парашыла падпісацца на «Зьвязду» з 1-га кастрычніка г. г.

Бюро пастанавіла арганізаваць спаборніцтвы паміж цэх'ячэйкамі на лепшую падпіску на «Зьвязду».

Усім бюро цэх'ячэек даручана вылучыць спэцыяльных таварышоў у якасьці ўпоўнаважаных па зборы падпіскі.

Пытаньне аб падпісцы на «Зьвязду» будзе таксама абмяркоўвацца на агульным сходзе партыйнага калектыву.

Бюро парткалектыву паставіла задачу: ніводнага камуністага без ЦО партыі—«Зьвязды».

Аб барацьбе з глушыцелямі самакрытыкі

(На сходзе рабкораў „Зьвязды"

На сход рабкораў «Зьвязды», які адбыўся 12 верасьня, зьявілася каля 30 чалавек. На вялікі жаль, прышло мала рабкораў непасрэдна з фабрык і заводаў.

У сваім дакладзе **«Аб барацьбе з глушыцелямі самакрытыкі»** тав. **Вінаградаў** паказвае, што за апошні час сямтам мы маем некаторае супакаеньне на фронце барацьбы за самакрытыку. Дзе-ні-дзе пачынаюць глядзець на самакрытыку, як на нешта звычайнае. Для формы прымуць агульныя пастановы і на гэтым супакойваюцца. Рад фактаў гаворыць аб тым, што ня ўсюды ў нас дбайнасьць рабочых мас на належнай вышыні. Ёсьць факты, калі гаспадарнікі, «недалюбліваюць» самакрытыку, ігнаруюць прапановы рабчых. Бывае, што маса не сыгналізуе своячасова аб недахопах. Бывае і наадварот—адпаведныя ўстановы, пры сыгналізацыі масы, не прадпрымаюць належных захадаў. Праходзіць час, справа забываецца, а ў выніку выкрываюцца «вялікія справы».

Пленум ЦК КП(б)Б падкрэсьліў, што **«самакрытыка ў нас ня была ўзьнята на бальшавіцкую вышыню, у нас часта крытыкавалі «гледзячы на асобы». Самакрытыка ва многіх выпадках была ня зусім дзейнай».** Пленум заклікае **«ўзьняць бальшавіцкую нянавісьць усёй партыі, усёй рабочай масы, накіраваць гураганны агонь на скрыўляючых генэральную лінію партыі, супроць канкрэтных асіцеляў правага ўхілу—зьяўляецца баявой задачай сёнешняга дня».** У чыстцы вясковых парт'ячэек масы рабочых і працоўнага сялянства былі ня ўсюды дастаткова мабілізаваны. Гэта сьведчыць аб тым, што наша перадавыя арганізацыі ня справіліся з мабілізацыяй мас на сацыялістычнае будаўніцтва.

Акруговыя кантрольныя камісіі не заўсёды правільна ставяць пытаньні па правільным палітычным рэагаваньні на крытыку мас, выкрыцьці ў друку. Віцебская РСІ, ня гледзячы на тое, што рабкораўскі апарату гарадзкога камітэту ўзаемадапамогі, прыняў дзяляцкую рэзалюцыю. Гэта рэзалюцыя, зразумела, не дапамагла зьнішчыць недахопы. Ёсьць факты маруднага рэагаваньня на рабкораўскія заметкі ў Аршанскі РСІ. Нам трэба сур'ёзна заняцца справай перабудовы мэтадаў працы РСІ.

Трэба зьнішчыць павярхоўныя адносіны да матар'ялаў, якія ідуць зьнізу. Асобныя арганізацыі часта падзяляцку адносяцца да выяўленьня недахопаў. Ня любяць, каб масы кантралявалі. Вядуць папяровую барацьбу, замыкаючыся вузкім актывам.

Фактаў бюракратычных адносін да самакрытыкі ў нас ня мала. Больш яскравым прыкладам можа служыць менская мэблевая фабрыка. Там быў і зажым самакрытыкі, - і ігнараваньне прапаноў рабочых, і дрэннае партыйнае кіраўніцтва і ганеньне на рабкораў. Нядаўна ў Бабруйскай акрузе за самакрытыку быў зволены з працы на чыгунцы адзін камсамолец. Мясцовыя партыйныя арганізацыі сталі на абарону рабкора, але кіраўніцтва чыгункі ўсё-ж такі пастанавіла звольніць з працы. Прышлося ўмяшацца ў гэту справу ЦКК. **Неабходна арганізаваць паказальныя суды над такімі глушыцелямі самакрытыкі.**

У апошні час бюракратычны ўціск узмацніўся. Мы правялі агляд вытворчых камісій. Была праўлена масавая актыўнасьць. Рабочыя ўнесьлі шэраг каштоўных прапаноў па рацыяналізацыі вытворчасьці, па зьнішчэньні недахопаў. Не заўсёды ёсьць правільныя адносіны адміністрацыі да правядзеньня ў жыцьцё прапаноў рабочых. Такое становішча цярпець нельга. Мы павінны скарыстаць дэкрэт СНК СССР, які абавязвае адміністрацыю выконваць прапановы рабочых. У чыстцы савецкага апарату і парт'ячэек рабкоры прынялі слабы ўдзел. Масы ня былі належным чынам мабілізаваны. У асобных арганізацыях чыстка ня мела належных вынікаў. Чыстка павінна прайсьці з такімжа напружаньнем сіл, з такім-жа тэмпам, як праходзяць усе нашы баявыя пытаньні. ЦКК неабходна будзе сваімі сіламі правесьці пераправерку асобных зьвеньняў апарату, каб паказаць, як трэба праводзіць чыстку. Да чысткі цэнтральных устаноў мы павінны будзем скарыстаць увесь матар'ял які вызьвіўся пры чыстцы нізавых арганізацый.

Спробы змазаць крытыку мас праяўляюцца і ў нізавых зьвеньнях. Некаторыя сакратары партыйных ячэек, старшыні фабкомаў на заметкі рабкораў адпісваюцца казённымі абвяржэньнямі, прабуюць выведаць прозьвішча аўтара, імкнуцца апальмаваць рабкора. Гэта асаблівая форма зьдзеку над тым, хто дапамагае партыі і савецкай уладзе ў сацыялістычным будаўніцтве.

У нас вельмі часта баяцца здымаць з працы тых асоб, якія няправільна адносяцца да самакрытыкі, якія глушаць самакрытыку. Рабкоры павінны праводзіць абточаную лінію супроць таго, хто нядбайна адносіцца да самакрытыкі. Трэба адзначыць, што там, дзе ёсьць праяўленьне правага ўхілу,—ёсьць і адрыў ад мас і ігнараваньне самакрытыкі. Трэба памятаць, што нядбайныя адносіны да самакрытыкі ёсьць праяўленьне правага ўхілу, ёсьць спадарожнік таго, хто скажае лінію партыі. У ячэйцы НКЗ самакрытыка адсутнічала. Панавала падхалімства. Мы прад'явілі былому наркому, тав. Прышчэпаву, абвінавачаньне ў ігнараваньні друку. За ўсе праявы правага ўхілу партыя здымала і будзе здымаць з працы, будзе забараняць працаваць на адказных пасадах.

Рабкоры павінны выцягваць «на сьвет божы ўсіх глушыцеляў самакрытыкі», павінны разварушыць балоцістыя месцы, дзе самакрытыка не прайшла ў глыбіню.

У бліжэйшы час мы высоўваем задачу асьвятліць у лістку РСІ (пры газэце «Зьвязда») факты бюракратычных, няўважлівых адносін да самакрытыкі. Рабкоры «Зьвязды» ў гэтай справе павінны быць перадавымі.

У дапамогу ў чыстцы партыі рабкорам трэба ў сваіх замет

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Партыйная асьвета—магутная зброя ідэалёгічнага загартаваньня партыйных мас

Праз сыстэму партасьветы ўзмоцнім ідэёвую барацьбу супроць правага ўхілу, прымірэнцтва і „левых" загібаў

Праверым—ці ўсё зроблена для шырэйшага ахвату партыйнай сеткай шырокіх партмас

АБ СЫСТЭМЕ ТЭАРЫТЫЧНАЕ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ ПАРТЫЙНАГА І КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ

Пастанова ЦК УсеКП(б)

ЦК адзначае, што работа ў галіне павышэньня тэарытычнага ўзроўню кіруючых кадраў партыйнага актыву далёка не атрымала яшчэ таго разьвіцьця, якое дыктуецца агульнымі задачамі пэрыяду сацыялістычнае рэканструкцыі, а таксама новымі больш высокімі патрабаваньнямі, прад'яўленнымі да кожнага партыйнага актывістага ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы і разгорнутай актыўнасьці мас, а таксама больш складаных задач партыйнага кіраўніцтва. Ня гледзячы на павышэньне кантынгэнту і наляшэньне работы ІКП, курсаў марксызму, камвузаў і інш., гэта стацыянарная сетка можа ахапляць толькі нязначную частку кадраў. ЦК УсеКП(б) надае выключна вялікую ўвагу ўдзяненьню ў **сыстэматычную тэарытычную вучобу ўсяго партыйнага і камсамольскага актыву,** які працуе ў розных галінах будаўніцтва. Асноўная формай такой сыстэматычнай тэарытычнай вучобы, якая **спалучацца з практычнай работай,** ЦК прызнае завочнае навучаньне і самаадукацыю. Між тым, зараз самастойная работа партактыву над павышэньнем свайго тэарытычнага ўзроўню (завочныя курсы, кансультацыі, самаадукацыя) разьвіта зусім невыстарчальна, ахапляе малую частку кіруючага партактыву; у партарганізацыях ня створаны патрэбныя ўмовы для шырокага разгортваньня гэтай работы.

ЦК ставіць перед партарганізацыямі задачу дабіцца рашучага пералому ў справе тэарытычнае перападрыхтоўкі кадраў партактыву. Сыстэматычная работа над павышэньнем свайго тэарытычнага ўзроўню павінна быць важнейшым абавязкам усяго партыйнага актыву і асабліва кожнага камуністага, які выконвае кіруючую работу.

Адначасова з пашырэньнем сеткі партасьветы і спэцыяльных курсаў, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі партактыву, трэба асаблівую ўвагу зьвярнуць на рашучае разьвіцьцё сеткі вячэрніх СПШ, камвузаў, курсаў марксызму, а таксама ўсёй сыстэмы **завочнага навучаньня** і індывідуальнае самаадукацыі. Для гэтага ЦК лічыць неабходным правядзеньне з 1929-30 навучальнага году наступных мерапрыемстваў:

1. Пашырыць і сыстэматызаваць марксыцка-ленінскую вучобу ўсіх груп партактыву, які працуе на партыйнай, камсамольскай, савецкай, каапэрацыйнай, калгаснай, прафэсыянальнай рабоце, у прамысловасьці і ў партыйна-савецкім друку, зьвязаўшы яе з сеткаю саўпартшкол і камвузаў, курсамі марксызму і інстытутам чырвонай прафэсуры.

2. Стварыць пры СПШ, камвузах, курсах марксызму і ІКП **завочна-курсавыя аддзяленьні,** якія побач з мерапрыемствамі кароткатэрміновай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі партпрацаўнікоў (гл. пастановы ЦК УсеКП(б) аб камвузах і саўпартшколах) арганізуюць у плянавым парадку на больш доўгі час перападрыхтоўку розных груп партактыву на сыстэме завочнага навучаньня з кароткатэрміновымі курсамі-канфэрэнцыямі завочнікаў.

Пры гэтым:

а) завочнакурсавыя аддзяленьні саўпартшкол арганізуюць у аб'ёме праграмы саўпартшкол перападрыхтоўку **нізавога** актыву сельскіх раёнаў і ячэек партыі і камсамолу, актыву вытворчых ячэек, заўкомаў, нізавога савецкага апарату, працаўнікоў калгасаў, хатнікаў і інш.;

б) завочнакурсавыя аддзяленьні камвузаў арганізуюць у аб'ёме праграмы камвузаў перападрыхтоўку **раённага** партыйнага, камсамольскага і савецкага актыву (члены бюро райкомаў, сакратары вытворчых ячэек, ячэек буйных калгасаў і саўгасаў), членаў прэзыдыуму РВК, працаўнікоў друку (пры «ГІЖ»), рабочых-прапагандыстых, палітасьветпрацаўнікоў, грамадазнаўцаў масавых школ сацвыхаву і прафобру (пры АКВ);

в) завочныя курсы марксызму арганізуюць перападрыхтоўку кіруючых кадраў цэнтральных устаноў, **абласных, акруговых** камітэтаў партыі, камсамолу, выканкомаў, прафарганізацый, каапэрацыйных органаў і партыйна-савецкага друку;

г) ІКП арганізуе пераважна перападрыхтоўку кіруючага партактыву і партпрацаўнікоў у галіне навукова-дасьледчай, плянава-эканамічнай выкладчыцкай, а таксама працаўнікоў і іншых галін згодна іх індывідуальных заяў.

3. Забясьпечыць за партактывам, які праходзіць курс завочнага навучаньня, тры разы на тыдзень рабочы дзень ня больш, як у 8 гадзін, для работы над сваёй самаадукацыяй, а таксама забясьпечыць патрэбны час для вучобы таварышоў, камандыраваных на вячэрнія рабфакі, СПШ, вячэрнія аддзяленьні камвузаў, курсаў марксызму і г. д. Тым таварышом, якім у моц іх умоў работы не забясьпечаны тры рабочыя дні на тыдзень, разьмерам ня больш 8 гадзін работы, прадастаўляць, згодна асобных пастаноў парткомаў, у выключных выпадках звыш звычайнага дня адпачынку яшчэ 2-3 вольныя ад работы дні на месяц выключна для самаадукацыі і работы над сабою. Для груп партактыву, выкананўшых вызначаны адпаведнымі навучальнымі ўстановамі мінімум заданьняў па завочным навучаньні, арганізуюцца як у цэнтры, так і ў абласных і краёвых арганізацыях кароткатэрміновыя (1½ м.) курсы для замацаваньня атрыманых у выніку завочнага навучаньня ведаў. Сьпіс асоб, якія пасылаюцца на гэтыя курсы, зацьвярджаецца адпаведнымі акругкомамі. Агульны штогодны кантынгент курсаў вызначаецца ЦК УсеКП(б).

4. Не абмяжоўваючы жорсткімі разьвёрсткамі завочнае навучаньне і абслугоўваючы магчыма шырокія кадры партыйнага і камсамольскага актыву дапамогаю ў яго самаадукацыі праз забясьпячэньне друкаванымі выданьнямі, кансультацыю і рэцэнзаваньне кантрольных работ, устанавіць наступныя арыентовачныя кантынгенты завочнага навучаньня:

а) для завочнакурсавых аддзяленьняў, саўпартшкол і акруговых курсаў партактыву—ня менш 50 тыс. чалавек;

б) для завочнакурсавых аддзяленьняў камвузаў—ня менш 10 тыс. чалавек; для завочных курсаў марксызму (уключаючы камсамольскае аддзяленьне)—да 2 тысяч чалавек;

в) для завочнай кансультацыі ІКП—1.000 чалавек.

Курсы склікаць часткова ў Маскве, часткова ў абласных і краёвых цэнтрах.

Сетка і кантынгенты акруговых курсаў партактыву і завочнакурсавых аддзяленьняў саўпартшкол і камвузаў устанавіць ЦК нацкампартый, абкомам і крайкомам УсеКП(б) па ўзгадненьні з наркамасьветы рэспублік і з сапкцыі АПАД ЦК УсеКП(б).

Даручыць АПАД ЦК УсеКП(б):

а) разам з ГПШ, курсамі марксызму і ІКП распрацаваць вучэбныя пляны і праграмы сыстэмы завочнакурсавога навучаньня партактыву;

б) праверыць якасьць, тыражы і парадак распаўсюджаньня спэцыяльных выданьняў, кіруючых завочным навучаньнем партактыву («Завочныя курсы марксызму», «Завочны камунівэрсытэт», «У дапамогу партвучобе»;

в) разам з праўленьнем ІКП забясьпечыць выданьне з 1929-30 г. бюлетэню завочнай кансультацыі ІКП;

г) арганізаваць сыстэматычны выезд у мясцовыя партарганізацыі кваліфікаваных лектараў для чытаньня цыкляў лекцый на тэарытычных пытаньнях марксызму-ленінізму;

д) Дзяржвыдавецтву РСФСР пры вызначэньні тыражоў навучальных дапаможнікаў, улічыць патрэбнасьць сеткі завочнага навучаньня.

5. ЦК УсеКП(б) зварачае ўвагу партарганізацый на тое, што ў радзе выпадкаў працаўнікі, адсталыя ў сваім палітычным разьвіцьці і якія маюць па родзе сваёй работы магчымасьць сыстэматычна займацца самаадукацыяй, гэтай работы не вядуць. Разам з тым ЦК адзначае, што ў радзе выпадкаў сыстэматычнай вучобе партактыву перашкаджаюць невыстарчальная ўвага да гэтай работы з боку партарганізацый і неналаджанасьць іх работы ў справе арганізацыі завочнага навучаньня і самаадукацыі.

ЦК абавязвае партарганізацыі ўлічыць усе групы партактыву, якім патрэбна тэарытычная вучоба, разьмеркаваць іх па асобных відах завочнага навучаньня, арганізаваць сыстэматычную дапамогу завочнікам (пісьмовая і вусная кансультацыя, правядзеньне мясцовых кароткатэрміновых канфэрэнцый завочнікаў, папаўненьне бібліятэк і партбібліятэў максыцка-ленінскай літаратурай і вучэбнымі дапаможнікамі і іншымі) і ўстанавіць сыстэматычнае кіраўніцтва работаю завочнікаў, змагаючыся з выпадкамі ўхіленьня ад марксыцка-ленінскай вучобы, як з парушэньнем партыйнай дырэктывы.

Самаадукацыя—адна з важных форм партасьветы

Займацца самаадукацыяй могуць толькі адпаведна падрыхтаваныя таварышы

Самаадукацыя, як адна з форм партыйнай асьветы, за апошнія гады заваявала сабе паважнае месца. Член партыі або беспартыйны актывісты, які, дзякуючы ўмовам сваёй работы, ня можа наведваць школы або гурткі, павінен выбіраць сабе форму вучобы—самаадукацыю.

Аднак, практыка апошніх двух год паказала, што самаадукацыя па Менскай акруговай партарганізацыі як у горадзе, так і ў вёсцы прышчапілася вельмі слаба. Прычынай гэтаму паслужыла тое, што ячэйкі няправільна падыходзілі да справы запісу ў лік тых, што займаюцца самаадукацыяй. Ячэйкі запісвалі туды таварышоў, слаба падрыхтаваных палітычна і па агульнаадукацыйных прадметах.

А хіба можа самаадукоўвацца той таварыш, які ня ўмее чытаць, або калі ён чытае, дык не разумее прачытанага. Вязумоўна, такі таварыш займацца самаадукацыяй ня можа. Для такіх таварышоў, калі яны па ўмовах сваёй працы ня могуць наведваць школу, трэба практыкаваць якіз-небудзь іншыя формы вучобы (індывідуальнае прымацаваньне да больш падрыхтаваных таварышоў і інш.).

Другой, больш важнай прычынай слабой прывіўкі самаадукацыі зьявілася тое, што партыйныя ячэйкі не правяралі, ці займаюцца тыя таварышы самаадукацыяй, якія на гэта запісаліся. Партыйнае таксама невыстарчальна правяраў, як гэтыя таварышы займаюцца самаадукацыяй.

У гэтым годзе праца па пальборы таварышоў для вучобы праз форму самаадукацыі павінна праходзіць наступным парадкам.

Партыйныя ячэйкі ў часе камплектаваньня ўсёй сеткі партыйнае асьветы, дапушчаючы поўную свабоду выбару форм вучобы для тых таварышоў, якія заняты рознымі работамі, павінны рэкамэндаваць самаадукацыю. Пасьля сканчэньня камплектаваньня сьпісы на тых, якія запісаліся, займаюцца самаадукацыяй, павінны быць дасланы ў партыйны габінэт з указаньнем, якім прадметам таварыш хоча займацца. Гэтыя таварышы павінны быць скліканы на нарады па сваіх прадметах для таго, каб з імі абгаварыць пытаньне, як займацца самаадукацыяй, якую мэту ставіць перад сабой той прадмет, які таварыш будзе вывучаць і прыблізна павінна быць абгаворана, як апрацаваць першыя заданьні па прадмеце.

Вучот тых, што займаюцца самаадукацыяй і самае галоўнае, вучот іх работы павінен быць пастаўлен так, каб таварыш адчуваў адказнасьць, ведаў, што ў паказаны ў заданьні тэрмін ён павінен скончыць прапрацоўку і здаць матар'ял у партгабінэт.

Гэта сыстэма больш спрыяе разьвіцьцю самаадукацыі ў горадзе, бо таварыш у паказаны тэрмін можа прыйсьці ў габінэт і там у кансультанта, да якога ён прымацаваны, можа праверыць, як ім прапрацаван матар'ял і якія ў яго меліся памылкі або непаразуменьні і тут-жа атрымаць чарговае заданьне. Горш справа стаіць з таварышамі раённай, якія прыяжджаць у габінэт ня могуць і павінны даваць пісьмовы матар'ял, да чаго яны яшчэ зусім ня прывычаны, і часамі пры добрым зразуменьні апрацаванага матар'ялу пісьмова выкладаюць свае думкі вельмі і вельмі дрэнна Тут бясспрэчна тое, што ў гэтым асноўную віну павінны ўзяць на сябе нашы АПШ і ВСПШ, якія на працягу некалькіх год заняткаў з гэтымі таварышамі не навучылі іх самастойна працаваць над кнігай і інш. матар'ялам, не навучылі фіксаваць гэты матар'ял на паперы.

Вось чаму для гэтых таварышоў мяркуецца ў першыя часы высылаць прыблізныя формы і паказаньні, як працаваць самастойна над кнігай і матар'ялам, як запісваць гэты матар'ял на паперы.

Для таго, каб і ў гэтым годзе выкараніць такія настроі,—«самаадукацыя—самашуканства», ячэйкі штодзённа павінны сачыць за тым, што робяць тыя таварышы, якія запісаліся па самаадукацыю. З свайго боку партыйны габінэт павінен напамінаць гэтым таварышом аб неабходнасьці свачасовай здачы матар'ялаў і калі пасьля двух раз напамінаньня таварышы ўсё-ж не здаюць матар'ял, паведамляць аб гэтым партыйную ячэйку і паказанаму таварышу, што ён з заняткаў па самаадукацыі зьняты, для таго, каб ячэйка магла ведаць, што гэты таварыш вучобай не заняты.

Гэткай сыстэмай будзе кіравацца ў гэтым годзе Менскі партыйны габінэт, гэткай сыстэмы прыблізна павінны прытрымлівацца і панава арганізаваныя партыйныя габінэты па раёнах. У працэсе работы неабходна (гэта мяркуе Менскі партгабінэт) склікаць нарады тых, што займаюцца па самаадукацыі, для падагульваньня асобных АКВ метаў, а ў канцы году склікаць менш доўгатэрміновую канфэрэнцыю па падагульваньні ўсяго курсу. Толькі гэта пастаноўка можа забясьпечыць сапраўдную прывіўку самаадукацыі.

В.

Папярэднія вынікі камплектаваньня сеткі партвучобы ў Мінску

Гэтымі днямі пры АПА Менскага акругкому адбылася нарада агітпрапработнікаў па пытаньнях камплектаваньня сеткі партасьветы. **Па Фрунзаўскім раёне,** як вывялася на нарадзе, праведзена значная падрыхтоўчая работа. Райком партыі своечасова даў дырэктывы ячэйкам аб скліканьні ячэйкавых нарад, на якіх дэтальна абмяркоўваліся пытаньні камплектаваньня школ.

Па папярэдніх падліках па Фрунзаўскім раёне ў АПШ займаецца 900 чалавек, у ВСПШ — 600, у вячэрнім камвузе — 140, з іх беспартыйных — 5 проц., жанчын — 15 проц. і камсамольская актыву — 12 проц.

Па асобных прадпрыемствах арганізаваны 23 групы АПШ і тры групы пры саўгасах; у гэтых групах займаюцца таксама і беспартыйныя рабочыя. На заводзе «Камунар», у Меншвэ і пры саюзах тэкстыльшчыкаў і дрэваапрацоўшчыкаў арганізаваны вьменныя групы. Школы ў асноўным памяшканьнямі забясьпечаны, праўда, ёсьць некаторы недахват у памяшканьнях, але нязначны і ён ня можа пагражаць зрыву вучобы. У бліжэйшы час райком склікае нараду кіраўнікоў школ, на якой падвядзе некаторыя вынікі камплектаваньня школ і пачатку заняткаў, абмяркуецца пытаньне, як падалей лепш паставіць вучобу.

Па **Кастрычнікавым раёне** таксама праведзены ячэйкавыя нарады, акрамя таго склікалася нарада кіраўнікоў школ і да гэтага часу ў АПШ завербавана 500 чал., у ВСПШ — 200 чал. і ў вячэрні камвуз — 75 чал.

Па Кастрычнікавым раёне па 12 прадпрыемствах будзе арганізавана 20 груп АПШ, 2 раённыя партыйныя школы, якімі будзе ахоплена 800 чалавек.

Зьменныя групы будуць арганізаваны на гарбарні «Бальшавік».

Сярод масы партыйцаў праведзена значная растлумачальная работа. **Р. С.**

НА СХОДЗЕ АКТЫВУ ФРУНЗАЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б

Ні на мінуту не паслабляць барацьбы з правым апартунізмам і прымірэнцтвам

ШЫРЭЙ РАЗГАРНУЦЬ БАЛЬШАВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ

РАШУЧА ЎДАРЫМ ПА ТЫХ, ХТО СКАЖАЕ КЛЯСАВУЮ ЛІНІЮ

Аб канкрэтных праявах правага ўхілу

(З дакладу тав. ГУРЭВІЧА)

Спачатку свайго дакладу тав. **Гурэвіч** коратка падагуліў вынікі верасьнеўскага пленуму ЦК КП(б)Б і адзначыў вялікае палітычнае значэньне пастаноў пленуму для далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва. Потым дакладчык вычарпальна ахарактарызаваў ролю і значэньне самакрытыкі ў барацьбе з канкрэтнымі праявамі правага ўхілу і скажэньнямі клясавае лініі.

Тав. **Гурэвіч** падкрэсьліў, што самакрытыка павінна стаць асноўным мэтадам нашай практычнай работы і магутнай зброяй у барацьбе з правымі апартуністымі, нацыянал-дэмакратамі і прымірэнцамі. Побач з гэтым тав. Гурэвіч адзначыў, што Фрунзаўская партарганізацыя яшчэ ня досыць шырока разгарнула самакрытыку і крытыку і што задача разгортваньня сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкі, «ня гледзячы на асобы», зьяўляецца першачарговай баявой задачай партыйнай арганізацыі. Пасьля гэтага тав. **Гурэвіч** перайшоў да асноўнага пытаньня свайго дакладу—да пытаньня аб канкрэтных праявах правага ўхілу ў Фрунзаўскай арганізацыі.

Я буду гаварыць аб апошніх фактах скажэньня клясавай лініі, якія мы выявілі па некаторых установах. Возьмем, напрыклад, Белдзяржстрах, дзе мы выявілі правую практыку на справе. Высьветлілася, што ніякай дыфэрэнцыацыі ў тарыфах страхаваньня няма. Калі мы гэтыя пытаньні разглядалі ў раённым камітэце партыі, дык загадчык Бабруйскага акрстраху паставіў гэта пытаньне так:

— Чаго вы шукаеце ў нас дыфэрэнцыяцыі, калі вы будзеце так падыходзіць, то дойдзеце да таго, што, мабыць, па чыгунцы ёсьць скрыўленьне клясавай лініі, бо там таксама няма дыфэрэнцыяцыі і з усіх пасажыраў за білеты бяруць аднолькавую плату.

Зразумела, таварышы, што мы так пытаньня ня ставім. Трэба мець на ўвазе, што Белдзяржстрах — установа, якая мае надта вялікае дачыненьне да вёскі. Паводле палітыкі Белдзяржстраху цэрквы і сынагогі плацяць страхоўкі менш, чым сяляне, і прыраўноўваюцца ў гэтых адносінах да дзяржаўных і музэйных устаноў. У Менску шмат дамоў не муніцыпалізаваны. Мы аб гэтым гаварылі яшчэ на нашай партканфэрэнцыі. Аказваецца, што і тут Белдзяржстрах прылажыў сваю руку. Ён так ацэньваў дамы, што дом, коштам у 200 тыс. руб., ацэньваўся ў 75 тыс. На падставе гэтага камгас не муніцыпалізаваў шмат якія дамы, бо па сваім кошце, паказаным Белдзяржстрахам, яны не падлягалі муніцыпалізацыі.

Яўнае праяўленьне правага ўхілу мы мелі ў Менакрфа. У акрфа на працягу некалькіх год скажалася клясавая лінія і праводзілася няправільная, па сутнасьці шкодная палітыка. Мы мелі там недаабкладаньне буйных непманаў і гандляроў і саматужнікаў, якія эксплёатавалі наёмную сілу. Большасьць прыслужнікаў рэлігійных культаў недаабкладзена. Акрфа не абкладаў вайсковым падаткам тылаапалчэнцаў.

Таварышы. Аб Наркамземе шмат пісалі, і таму я доўга аб гэтым гаварыць ня буду.

У палітыцы Наркамзему ёсьць яскравыя праяўленьні правага ўхілу. Тут ёсьць скажэньні клясавай палітыкі, тут ёсьць ярая кулацкая лінія. Я скажу галоўнае, асноўнае, у чым тут справа.

Галоўная думка, выказаная Прышчэпавым, круцілася вакол аднаго — гэта стаўка на моцнага мужыка, і пасьля гэтага ідуць і нормы, якія былі ў Наркамземе, пасьля гэтага ідуць і адносіны да хутароў, пасьля гэтага ідуць адносіны да ўсіх пытаньняў, да ўсёй нашай лініі партыі.

На Наркамземе я доўга спыняцца ня буду, перайду да таго, што да работы Наркамзема прыстасоўваліся і іншыя ўстановы, тыя ўстановы, якія рыхтавалі нам кадры—НКАсьветы.

Яшчэ адзін факт. Возьмем навукова-дасьледчы інстытут імя Леніна. Тое, што мы выявілі ў гэтым інстытуце, паказвае, што ён ня мае права насіць імя Леніна, бо ён не праводзіў ленінскай лініі, бо ўся работа яго была няленінская. Маленькі прыклад: НДІ мае інстытут сялян-дасьледчыкаў. Паводле статуту дасьледчыкамі могуць быць сяляне-беднякі, сераднякі і... інш. А запаўнялі інстытут дасьледчыкаў гэтыя самыя «іншыя». Здаецца, што ў статуце слова «кулак» не напісана, але, калі ёсьць слова «іншыя», дык заможнікі мелі магчымасьць пралезьці ў інстытут і захапіць усё ў свае рукі. Вось як прыстасоўвалася навуковая ўстанова да работы Наркамзему.

Пераходжу да пытаньня аб ухілах у практычнай рабоце, якія мы маем у галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Мне тут з Белдзяржвыдавецтва далі сьпіс тых кніг, якія ўжо выйшлі з друку, якія прайшлі праз усе палітрэдакцыі, і Галоўліту, і Белдзяржвыдавецтва і якія пасьля ўсяго гэтага па выхадзе з друку былі канфіскаваны. У гэтым сьпісе налічваецца 8 назваў розных кніг, якія былі канфіскаваны пасьля выхаду з друку. Я лічу, што гэты сьпіс далёка ня поўны. Тут ёсьць толькі 8 назваў, мы-ж ведаем, што адна часопісь **«Полымя»** затрымлівалася некалькі раз, а ў гэтым сьпісе «Полымя» фігуруе толькі адзін раз. Такім чынам, гэты сьпіс зьяўляецца ня поўным. Якія-ж назвы мы маем у гэтым сьпісе. Гэта—«славуты» **споўнік,** які разышоўся па ўсёй Беларусі, які зьяўляецца падручнікам для ўсіх нас, па якім шмат хто з нас вывучаў беларускую мову. Далей—праваліс **Лёсіка,** 8-ае выданьне. Потым падручнік **Гарбацэвіча** для масавай школы **«Рабочая кніжка на роднай мове»;** потым кніга **«Мападая Беларусь»,** часопісь **«Полымя»,** насьценны календар, кніжка **«Наша сіла—асьвета»** і г. д. і г. д. Мы ведаем і такі факт, што самі рабочыя 1-ай друкарні затрымалі адну кніжку і не хацелі яе друкаваць.

Калі я быў на сходзе ячэйкі Белдзяржвыдавецтва я проста паставіў пытаньне так: мы жорстка крытыкавалі рабочых Меншвэю за дрэнную якасьць прадукцыі, але, калі мы ганьбілі меншвэўцаў, то па ячэйцы Белдзяржвыдавецтва мы павінны ўдарыць мацней, раз Белдзяржвыдавецтва выпускае нізкаякасную кніжную прадукцыю. Тут, зразумела, трэба біць мацней, бо гэта-ж справа выхаваньня нашых кадраў, выхаваньня працоўных мас. На гэтым-жа сходзе ячэйкі я выслухаў выступленьне т. Зарэцкага, выступленьне памылковае, але я ня чуў, каб з боку ўсёй ячэйкі быў даны рашучы адпор гэтаму выступленьню.

Далей т. Гурэвіч падкрэсьлівае тыя прарывы, якія былі ў рабоце НКАсьветы ў справе выхаваньня новых кадраў і спыняецца на рабоце Белдзяржмузэю. Тав. **Гурэвіч** адзначае, што ў музэі, вельмі мала рэвалюцыйных матар'ялаў, затое яўрэйскі аддзел музэю ўвесь укамплектаваны рэлігійнымі экспанатамі, якія падабраны з надзвычайнай старанпасьцю.

Да гэтага экспанату трэба дадаць яшчэ адзін вельмі добры мастацкі бронзавы бюст былога міліянэра Палякова. Дзеля чаго ён стаіць—невядома.

Калі возьмем склад супрацоўнікаў гэтага музэю, то там мы маем вельмі многа сынкоў былых папоў, дзяцей папоў, цэлую такую сямейку і ясна, што яна вызначае работу музэю.

Далей, таварышы, гаворачы аб канкрэтных праявах правага ўхілу, я лічу неабходным спыніцца і на канкрэтных праявах рэштак трацкізму, які злучаецца па практыцы з правым ухілам.

Што мы мелі ў працкалетыве мэблеўшчыкаў. Мы тут выявілі такое зьявішча, што 6 членаў ячэйкі былі ў апазыцыі пад кіраўніцтвам былога апазыцыянэра **Воўкава,** які зараз член партыі.—Мы ўжо прасілі ЦКК пераглядзець аб ім справу.

Сакратар ячэйкі былы трацкісты і ўжываліся там трацкісцкія мэтады. Побач з сябраваньнем з прыватнікам там ужываліся мэтады забастоўкі: не падабалася расцэнка—бастуюць, машына не падабалася—аб'яўшчаюць байком машыне. Гэта лічылася нармальным. Загадчык працкалектыву прыходзіў у Райком, з вялікай папкаю вялікіх чарцяжоў і плянаў, але ні ячэйка, ні сакратар ячэйкі ніколі ня лічылі магчымым давесьці да ведама РК аб тых забастоўках, якія былі.

Такія мэтады работы яны лічылі нармальнымі, бо гэта праходзіла з удзельнічаньнем камуністых, з удзелам прафпрацаўнікоў на мясцох. Я лічу патрэбным завострыць увагу на гэтым пытаньні.

Значную частку свайго дакладу тав. **Гурэвіч** прысьвяціў пытаньню аб самакрытыцы і рэагаваньні на рабкораўскія заметкі. Тав. Гурэвіч падаў факты, якія сьведчылі аб зажыме самакрытыкі ў некаторых ячэйках.

У Белдзяржстраху цкавалі за сумленную самакрытыку і звальнялі з пасады. Рэдкалегія не прапускала заметак, у якіх крытыкаваліся адказныя працаўнікі ўстановы.

У працкалектыве мэблеўшчыкаў зьдзекваліся над рабкорам **Хінічам.** Загадчык працкалектыву ня даў ніякага адказу на 150 рабкораўскіх заметак. Падагульваючы гэтыя факты, тав. **Гурэвіч** падкрэсьлівае неабходнасьць рашучай барацьбы з глушыцелямі самакрытыкі.

Як ячэйкі рэагавалі на ўсе гэтыя факты. Як яны змагаліся з скажэньнем клясавай лініі, канкрэтнымі праявамі правага ўхілу і з глушыцелямі самакрытыкі? Тав. Гурэвіч падае рад фактаў, якія сьведчаць, што некаторыя ячэйкі не рэагавалі на правыя скажэньні ў практычнай рабоце і не разгарнулі самакрытыкі і крытыкі.

Учора быў, сход ячэйкі Белдзяржвыдавецтва, на якім разглядалася пытаньне аб артыкулах «Зьвязды» і «Акцябра» з поваду выступленьня т. Зарэцкага. Ячэйка разгледзела гэта пытаньне і ўхваліла адпаведную рэзалюцыю. Я зараз гэту рэзалюцыю атрымаў і хачу расказаць аб ходзе галасаваньня. Як ацаніць выступленьне? Чакаюць, нікто ня хоча гаварыць—так інфармаваў мяне старшыня сходу. Потым адзін член ячэйкі выступае і гаворыць, што трэба кваліфікаваць выступленьне Зарэцкага, як аб'ектыўна правае, якое супадае з нацыянал-дэмакратызмам і г. д. Я ня маю фармалёўкі рэзалюцыі. Але як-жа там прайшло галасаваньне. Група партыйцаў галасавала супроць гэтае пастановы, а частка членаў ячэйкі ад галасаваньня ўстрымалася. І гэта пасьля пленуму ЦК КП(б)Б, пасьля таго, як ЦК завастрыў увагу ўсёй нашай арганізацыі на барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам, на барацьбе з правай небясьпекай. Ці атрымала ячэйка ўрок таго, што было пры разглядзе справы Зарэцкага? Зарэцкі падпісаў усім вядомы ліст трох пісьменьнікаў, які па сутнасьці зьяўляецца антыпартыйным і шкодным выступленьнем. Калі я прышоў у ячэйку на разгляд гэтае справы, то ў ячэйцы я не атрымаў ніякай дапамогі. Члены ячэйкі замазалі палітычны сэнс справы Зарэцкага, выступалі і гаварылі, што ніваваты не Зарэцкі, а універсытэт. Усе выступалі ў абарону Зарэцкага. Я скажу проста, таварышы, на сходзе амаль што хацелі ставіць на галасаваньне пытаньне аб тым-ці даваць мне слова, ці не. Вось як падышла ячэйка да разгляду палітычнага пытаньня, «Дзённік Віленскі» ў Зах. Беларусі разумеў вялікую палітычную сутнасьць гэтага пытаньня. Там яны ацанілі гэтую справу, але ў ячэйцы не ацанілі, як належыць, і пасьля гэтага на сёнешні дзень мы зноў маем такое галасаваньне. Што мы можам сказаць аб ячэйцы Белдзяржвыдавецтва? Па нашай думцы, ЦКК напэўна будзе прымушана выдзеліць туды і чым хутчэй камісію, каб так прачысьціць ячэйку, каб яна здолела сапраўды выконваць пастановы пленуму ЦК. Трэбаачысьціць ячэйку ад тых, хто праводзіць нацыянал-дэмакратычную лінію, хто ідзе побач з нацыянал-дэмакратыяй. Трэба пабальшавіцку вызваліць нашы рады ад такіх элемэнтаў.

Я ня буду гаварыць аб ячэйцы працкалектыву мэблеўшчыкаў. Адзін склад гэтай ячэйкі гаворыць за тое, што ячэйка не магла рэагаваць на скажэньні партыйнай лініі. Усяго ў ячэйцы было 12 чал.: 6 чал. былыя трацкістыя, сёмы—загадчык, якога мы зьнялі з работы. Восьмы—«партыец», які судзіцца за пакражу, дзевяты—прымацаваны да ячэйкі, зьняты з работы ў Мазыры за ўдзел у мазырскіх «справах». Зразумела, што ячэйка з такім складам нічога не зрабіла па барацьбе з вылазкамі трацкістых, зажымам самакрытыкі, безгаспадарчасьцю, зрастаньнем з прыватнікамі і г. д.

Нарэшце, т. Гурэвіч гаворыць аб тым, як раённы камітэт змагаўся з канкрэтнымі праявамі прагага ўхілу, як ён рэагаваў на скажэньне правільнай лініі ў рабоце ячэек.

— Мы на працягу ўсяго часу ставілі пытаньне перад усёй нашай партыйнай арганізацыяй аб рашучай барацьбе з праявамі правай небясьпекі, завастралі ўвагу партыйных ячэек на барацьбе з апартунізмам, за выразнае правядзеньне генэральнай лініі. Раённы камітэт, разглядаючы пытаньні аб канкрэтных праявах правага ўхілу ў рабоце ячэек, ухваляў рашучыя пастановы. Мы ня спыняліся ў такіх выпадках перад жорсткімі мерамі. У Белдзяржстраху мы расьпусьцілі бюро ячэйкі, расьпусьцілі мясцкм. паставілі пытаньне аб зьняцьці кіраўніка тав. Чарнушэвіча з працы. У працкалектыве мэблеўшчыкаў мы расьпусьцілі бюро ячэйкі, зьнялі з працы загадчыка і выключылі з партыі сакратара ячэйкі. Справу Зарэцкага, які ўдзельнічаў у лісьце «трох пісьменьнікаў», мы вельмі доўгі час разглядалі. Мы ставілі перад Зарэцкім умову, каб ён прызнаў свае памылкі. Зарэцкі з намі тарграваўся, ён заявіў, што ён параіцца з тымі таварышамі, з якімі ён падпісваў ліст. Мы выключылі Зарэцкага з партыі; гэта ўхваліла ўся партыйная арганізацыя, калі на актыве аб гэтым было сказана, актыў высказаў сваю салідарнасьць у гэтым пытаньні з раённым камітэтам воплескамі. Я лічу, што тут з боку ЦКК была дапушчана памылка. Я не настайваю на тым, што Зарэцкага трэба абавязкова выключыць, што нашу пастанову трэба абавязкова зацьвердзіць. Я наогул ніколі ня ставіў так пытаньня, што калі ЦКК адмяняе тыя ці іншыя нашы пастановы, дык яна паступае няправільна. Магчыма, што потым, пасьля таго, калі мы выключылі, ЦКК магла пагаварыць з таварышом, і аднавіць яго. Але, як у даным выпадку аднавілі Зарэцкага? Прадстаўніка раённага камітэту ЦКК нават на выклікала. Ня ведаю, як гэта здарылася, але толькі на другі дзень я даведаўся пра пастанову ЦКК.

Гэта так. Некаторыя нават жартуюць і кажуць, што яшчэ да таго, як мы выключылі Зарэцкага, ЦКК яго ўжо аднавіла. Нашага прадстаўніка ня выклікалі, і нават раённы камітэт да гэтага часу не атрымаў выпіскі ЦКК аб аднаўленьні Зарэцкага, і я толькі старонкаю даведаўся, што ЦКК пастанавіла адмяніць пастанову райкому. І вось гэты факт я лічу няправільным. Я лічу, што калі ЦКК прызнае патрэбным адмяніць пастанову райкому, дык растлумачце, калі ласка, нам справу, растлумачце, чаму наша пастанова была няправільнай, а то выходзіць так, што калі мы асудзілі Зарэцкага за яго выступленьне, дык мы няправільна яго асудзілі. Але я-ж не магу згадзіцца з тым, што ЦКК ставіла так пытаньне, што ў райкому быў няправільны падыход адносна Зарэцкага. Так ня выхоўваюць, такія выхаваўчыя мэтады не годны.

Але побач з гэтым трэба адзначыць, што раённы камітэт партыі зрабіў шмат промахаў у пытаньнях барацьбы з канкрэтнымі праявамі правага ўхілу. Вось, напрыклад, справа акрфа. Раённы камітэт разглядаў справу сакратара ячэйкі, пастанавіў толькі: паставіць на від сакратару ячэйкі зьняць яго з работы і гэтым абмежаваўся. Райком не задумаўся над тым, што калі сакратар ячэйкі п'е, дык там нешта ня гладка. Потым, калі на працягу некаторага часу ў райком паступае адна справа, другая, трэцяя, чацьвертая—усе наконт п'янства ў ячэйцы акрфа, дык райком павінен быў зрабіць нейкія вынікі. Сакратар ячэйкі п'е, яшчэ 4 чалавекі п'юць—значыць, тут нешта няладнае. Далей, справа наконт 16 фінагентаў, справа якая нашумела па Беларусі. Райком аб гэтым ведаў, але ён не заглянуў у ячэйку, каб праверыць, што там робіцца; райком несваячасова рэагаваў на гэтыя зьявішчы. І зусім правільна АКК адзначыла гэта ў сваёй пастанове наконт Фрунзаўскага райкому.

Аднак, я не магу згадзіцца з фармулёўкай, вярней, не з фармулёўкаю, а з загалоўкам, які зьмешчан у «Зьвязьдзе». Там наконт гэтай справы «Зьвязда» дала такія загалоўкі: «Скрыўленьне клясавай лініі ў акрфа», а пад гэтым загалоўкам другі—«Фрунзаўскі райком не рэагаваў». Паставілі побач Фрунзаўскі райком і акрфа, і больш там нікога няма. Я з такім асьвятлень

Забясьпечыць праверку выкананьня сацдагавароў жывым кіраўніцтвам

Прафсаюзы паслалі паперкі і на гэтым супакоіліся. Ня думаюць пасылаць таварышоў на прадпрыемствы для дапамогі ў праверцы выкананьня сацдагавароў і заключэньня новых

ТОЛЬКІ ЦП МЕДСАНПРАЦЫ ВЫЛУЧЫЛА 29 ТАВАРЫШОЎ

Прэзыдыумам ЦСПСБ даны дырэктывы ўсім ЦП саюзаў і Акпрафбюро правесьці шырокія нарады прафактыву на якіх грунтоўна праверыць выкананьне дагавароў. Для жывога інструктажу ходу праверкі ЦП саюзаў павінны былі вылучыць з сваіх апаратаў 8 чалавек, а ЦСПСБ—2.

Што-ж непасрэдна зрабілі саюзы для выкананьня дырэктыў ЦСПСБ? Наколькі правільна саюзы зразумелі сваю ролю ў правядзеньні праверкі дагавароў па сацыялістычным спаборніцтве.

Трэба прама сказаць—саюзы яшчэ не раскачаліся, саюзы яшчэ нічога ня робяць. Сёньня ўжо 15-га верасьня, да сёньняшняга дню саюзы ўжо павінны былі кінуць сваіх работнікаў на месцы для інструктаваньня, але гэтага яшчэ ня зроблена. У правядзеньні падрыхтоўкі да праверкі выкананьня сацдагавароў амаль усе прафсаюзы (за выключэньнем аднагодвух) абмяжоўваюцца пісаніной. Рассылаюць абежнікі, інструкцыі, прапановы. Жывога непасрэднага кіраўніцтва няма.

Возьмем для прыкладу некалькі саюзаў.

Саюз папернікаў абмяжаваўся толькі «агульнай дырэктывай». Праўда, саюз намеціў добры пачатак. 19-га верасьня на шклоўскай папяровай фабрыцы «Спартак» саюз склікае ўсебеларускую нараду, у якой прымуць удзел старшыні ўсіх вытворчых камісій, усіх фабзаўмясцкомаў. Нарада склікаецца спэцыяльна для абмеркаваньня ходу сацыялістычнага спаборніцтва, для абгаварэньня раду пытаньняў, зьвязаных з праверкаю выкананьняў сацдагавароў і з падрыхтоўкаю да заключэньня новых дагавароў. Але на сёньняшні дзень усё гэта робіцца толькі на паперы, толькі ў «тэорыі».

Саюз гарбароў ставіў пытаньні праверкі выкананьня сацдагавароў на пасяджэньні прэзыдыуму цэнтральнага праўленьня. Таксама «дадзена дырэктыва» аб вылучэньні спэцыяльных брыгад для праверкі. А аб спэцыяльным вылучэньні адказных таварышоў з апарату ЦП для пасылкі іх на месцы гарбары зусім забыліся.

Саюз мэталістых па пры клаўіншых саюзаў таксама абмяркоўваў пытаньне на прэзыдыуме. Таксама «даў дырэктыву». Праўда ў выкананьне гэтай дырэктывы фабзаўмясцкомамі на прадпрыемствах ужо зьбіраюцца нарады прафактыву. А жывога непасрэднага кіраўніцтва ўсё-ж такі няма.

У саюзах харчавікоў, дрэваапрацоўшчыкаў, народнага харчаваньня амаль той-жа малюнак, амаль тыя-ж «агульныя дырэктывы».

Праўда, ёсьць саюзы, якія павінны быць вылучаны з агульнага раду.

ЦП саюзу мэдсанпрацы вылучыла 29 чалавек, у абавязак якіх уваходзіць праверка выкананьня дагавароў па сацыялістычным спаборніцтве. Гэтыя 29 таварышоў пойдуць па ўстановах, разьедуцца па раёнах, дзе будуць непасрэдна кіраваць працай, дапамагаць у праверцы і даваць належны напрамак пры заключэньні новых сацдагавароў. Ужо адбылася нарада гэтых таварышоў, яны належным чынам праінструктаваны.

Наогул-жа, трэба сказаць, што саюзы падрыхтаваны да праверкі сацдагавароў дрэнна. Неабходна безадкладна забясьпечыць праверку і перазаключэньне новых сацдагавароў, жывым кіраўніцтвам. Неабходна зараз-жа вылучыць спэцыяльны кадр таварышоў для гэтай справы.

Новы закон аб самаабкладаньні

Апублікаваны закон аб самаабкладаньні ў БССР павінен прыцягнуць да сябе ўвагу ўсёй бядняцка-серадняцкай часткі вёскі і ўсёй грамадзкасьці. У гэтым законе выразна адлюстраваны клясавая палітыка ў справе самаабкладаньня і двухгадовая практыка па правядзеньні самаабкладаньня ў жыцьцё.

З году ў год расьце прыбытковасьць бядняцка-серадняцкай часткі сяла. У зьвязку з гэтым, шпаркім тэмпам растуць культурныя яе запатрабаваньні. Мясцовыя бюджэты ня ў стане ўгнацца за гэтымі запатрабаваньнямі і многія з іх застаюцца таму незадаволенымі. Самаабкладаньне заклікана даваць новыя сродкі. бюджэту для правядзеньня ў жыцьцё намечаных культурна-гаспадарчых плянаў.

Мы тут спынімся на галоўнейшых зьменах новага закону.

У мінулым годзе самаабкладаньне рэгулявалася пасьцю законадаўчымі актамі, што прадстаўляла вялікія трудасьці для насельніцтва і для выканаўцаў закону. Новы закон зьнішчае гэты вялікі дэфэкт: у адным законадаўчым акце аб'яднаны ўсе элементы, якія вызначаюць парадак правядзеньня самаабкладаньня ў жыцьцё.

Гранічны разьмер самаабкладаньня ўстаноўлены ў 50 проц. у адносінах да сельска-гаспадарчага падатку (пасьля ўсіх скідак) заместе існаваўшых раней 35 проц. У гэтым годзе прагрэсія абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам моцна завострана ў адносінах найбольш буйных прыбыткаў. І таму цяжар самаабкладаньня з асаблівай сілай ляжа на кулацкія і высоказаможныя гаспадаркі.

З другога боку новы закон поўнасьцю вызваляе ад самаабкладаньня рабочых і служачых, якія маюць крыніцаю прыбытку заработную плату, і жыхароў пасёлкаў з пераважаючым пралетарскім насельніцтвам. Права вызваленьня пасобных бядняцкіх гаспадарак прадастаўлена сходам грамадзян і пленумам сельскіх і местачковых саветаў. У мінулым годзе гэтым правам карысталіся сельсаветы і райвыканкомы.

Зьмены, унесеныя ў закон, палягчаюць плацяжы для бядняцкай часткі сяла і павялічваюць плацяжы для кулацкай часткі. На гэтай глебе няўхільна вылазка клясавага ворага—кулака, у форме злоснай агітацыі супроць закону і адмаўленьня ад правядзеньня яго ў жыцьцё. Да барацьбы з гэтымі кулацкімі вылазкамі і ўсякімі «хітрыкамі» трэба падрыхтавацца загадзя шляхам аб'яднаньня ўсёй бядняцка-серадняцкай часткі вёскі вакол пытаньня аб самаабкладаньні.

З.

18 верасьня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому селяніна

адбудзецца

сход актыву камсамольскай арганізацыі

Білеты па райкомах

Абвестка дня: Вынікі верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б і задачы камсамольскай арганізацыі. Дакладчык — заг. АПА ЦК КП(б)Б *тав. Сянькевіч.*

МЕНСК

Хлеб гораду

У нядзелю, 15-га верасьня, у Менск прыбыў чырвоны абоз з хлебам. Некалькі дзесяткаў фурманак, нагружаных 2.500 пуд. хлеба, а 12 гадз. дня прыехалі на склад Менселькрэдытсаюзу. Абоз быў спатканы шэфамі з аркэстрам музыкі каля таварнай станцыі.

Каля будынку НКФ быў арганізаваны мітынг, на якім з прамоваю выступіў прадстаўнік рабочай дэлегацыі з Польшчы.

У склад абозу ўваходзілі фурманкі з Самахвалавіцкага раёну—1.056 пуд. хлеба, яўрэйскай камуны «Новы Шлях»—350 пуд. і з 7 вёсак прыгароднага сельсавету—1.400 пуд.

Улас.

Тав. Саевіч—рэктар Камвузу імя Леніна

У зьвязку з уходам т. Сянькевіча на работу ў ЦК КП(б)Б рэктарам Беларускага камуністычнага унівэрсытэту імя Леніна назначаны т. САЕВІЧ.

Да гэтага часу т. САЕВІЧ быў рэктарам Беларускай г.-с. акадэміі ў Горках.

***

Тав. САЕВІЧ нарадзіўся ў 1892 г. у Гродненскай губ. Бацькі яго беднякі-сяляне. Вучыўся ў настаўніцкай сэмінарыі, па сканчэньні якой два гады быў настаўнікам вясковых пачатковых школ.

Тав. САЕВІЧ скончыў тры курсы Сьвярдлоўскага камуністычнага унівэрсытэту. У апошнія гады ён быў загадчыкам Горацкага рабфаку, а за тым рэктарам Беларускай с.-г. акадэміі. У партыю т. Саевіч уступіў у 1917 годзе.

Вечар змычкі спэцыялістых з камсамолам

22-га верасьня Беларускае бюро ІТС разам з Фрунзаўскім райкомам камсамолу наладжвае вялікі вечар змычкі спэцыялістых з камсамолам. На вечары будуць заслуханы даклады ВСНГ аб выніках капітальнага будаўніцтва за першы год пяцігодкі, аб рабоце ўдарных брыгад і г. д. Рыхтуюцца выстаўкі браку прадукцыі і вытворчасьці.

Спачувальная тэлеграма з поваду сьмерці паэта Я. Райніса

Даведаўшыся аб сьмерці выдатнейшага паэты і грамадзкага дзеяча Латвіі Яна Райніса, «беларускае таварыства культурнае сувязі з замежамі адправіла ў Рыгу т-ву культурнага зблізьненьня з народамі СССР тэлеграму, у якой выказваецца глыбокае спачуваньне.

— У нашай сьвядомасьці,—гаворыцца ў тэлеграме,—заўсёды застанецца жывы ўспамін аб Я. Райнісу, як аб адным з піянэраў культурнага зблізьненьня Латвіі з БССР.

Усебеларуская гандлёвая нарада

30-га верасьня ў Менску склікаецца ўсебеларуская гандлёвая нарада Белкаапсаюзу. На абвестку дня пастаўлены даклад аб працы Белкаапсаюзу за 1928-29 г. і перспэктывы на 1929-30 г.

Канфэрэнцыя МОПР'у Фрунзаўскага раёну

Дэлегаты канфэрэнцыі мабілізавалі сябе добраахвотнікамі Далёка-Усходняй Чырвонай арміі.—59.000 р. сабрана добраахвотных узносаў.—На 1.969 р. паднесена аблігацый 3-яй пазыкі—падарункі палітзьняволеным падшэфных турмаў

15-га верасьня адбылася канфэрэнцыя МОПР'у Фрунзаўскага раёну.

Па дакладу АК МОПР'у і справаздачы райкому выступілі 23 дэлегаты, якія адзначылі дасягненьні ў працы МОПР'у па акрузе: уздым актыўнасьці і сьвядомасьці мопраўцаў гораду і вёскі па дапамозе палітвязьням. Усяго на дапамогу палітвязьням **сабрана за 1928-29 год добраахвотных узносаў каля 59 тыс. руб. Рост агульных паступленьняў сродкаў у параўнаньні з мінулым годам павялічыўся на 100 проц. (з 32 тыс. руб. у 1927 годзе на 65 тыс. руб. у 1928 годзе і за 7 мес. 1929 году).**

Да правядзеньня масавых мерапрыемстваў і розных мопраўскіх кампаній быў уцягнуты ўвесь гарадзкі актыў, а таксама шырокія працоўныя масы. Акругкомам праведзен сход, прысьвечаны VI канграсу Камінтэрну, мітынг пратэсту супроць прысуду над Беларускай Грамадой, інтэрнацыянальная экскурсія і карнавал.

На канфэрэнцыі быў падкрэсьлены актыўны ўдзел мопраўскіх арганізацый у сацыялістычным будаўніцтве СССР—у перавыбарах саветаў, пасеўкампаніі, сацыялістычным спаборніцтве, рэалізацыі пазыкі і інш.

Але разам з гэтым выступаўшыя ў спрэчках дэлегаты зазначалі і на адмоўныя бакі ў працы АК і райкому. Адсутнічаў пастаянны колькасны і якасны вучот членаў МОПР'у. Слаба праводзілася масавая выхаваўчая праца сярод мопраўцаў, слаба пашыралася мопраўская літаратура, невыстарчальна праводзілася праца на вёсцы, а таксама ня досыць абслугоўваюцца акругкомам і райкомам паасобныя групы мопраўцаў (вайсковыя, жактаўскія і вучнёўскія ячэйкі МОПР'у).

Для прывітаньня канфэрэнцыі зьявіліся прадстаўнікі мопраўскіх ячэек, якія **паднесьлі ў якасьці падарунку палітзьняволеным падшэфных турмаў 1.969 руб. аблігацыямі трэцяй пазыкі індустрыялізацыі.**

Канфэрэнцыю таксама віталі **дэлегаты Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны.** У сваіх прамовах яны адзначылі вялікую важнасьць дапамогі МОПР'у палітзьняволеным рэвалюцыянэрам-барацьбітом, якія пакутуюць ў капіталістычных турмах. **Польскія дэлегаты ад імя палітзьняволеных Польшчы перадалі братэрскую падзяку за дапамогу.**

Канфэрэнцыя вынесла пастанову лічыць усіх дэлегатаў канфэрэнцыі мабілізаванымі-добраахвотнікамі Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі.

ЦУДЗІН.

Перад прызывам 1907 году

Неадкладна зьнішчыць памылкі, што ёсьць на мясцох

Абслужым прызыўныя пункты

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Падрыхтоўка да прызыву 1907 г. у разгары. Для арганізацыі прызыўных пунктаў у Гомелі адведзены клюбы будаўнікоў і нарсувязі. Грамадзкія арганізацыі рыхтуюцца да адчыненьня на пунктах сваіх куткоў, якія будуць праводзіць культурна-асьветную работу сярод прызыўнікоў. На пунктах арганізуюцца сталы даведак. прадуктовыя ларкі і інш.

Няма ніякай работы

У Бярэзінскім раёне, Менскай акругі, падрыхтоўка да прызыву амаль што вусім не праведзена. Няма ніякіх сходаў, прызыўнікі нават ня ведаюць, што сёлета вынішчана жараб'ёўка.

Трэба хутка выправіць памылкі і ўзяцца як сьлед за працу, інакш кампанія прызыву будзе сарвана.

ПРЫЗЫЎНІК.

Цяганіна і няўважлівасьць

ВОРША. (Наш кар.). У Багушэўскім, Коханаўскім і Аршанскім раёнах не абышліся бяз хібаў і няўважлівых адносін у справе падрыхтоўкі да прызыву. У гэтых раёнах замарудзілі з разглядам ільгот прызываемым па сямейным і маемасным становішчы, замарудзілі працу па выяўленьні сацыяльна-чужога і злачынага элемэнту прызываемых, а таксама несваячасова і няправільна ў некаторых выпадках была выканана дырэктыва аб прызыўніках, гаспадаркі якіх абкладаюцца індывідуальным падаткам. Таксама і інспэктарыят палітасьветы зусім нічога не зрабіў у справе падрыхтоўкі да прызыву, не ўцягнуў у падрыхтоўчую працу палітасьветных ўстановы і грамадзкія арганізацыі. Арганізацыі «Чырвонага Крыжу» і Асоавіяхіму таксама ня ўсюды падрыхтаваліся да сустрэчы прызыву, ня гледзячы на дырэктывы акругі.

Адзначаючы ўсё гэта, прэзыдыум акрвыканкому запрапанаваў усім райвыканкомам і гарсаветам яшчэ раз перагледзець сьпісы прызыўнікоў з мэтаю іх стопроцантнага ачышчэньня ад сацыяльна-чужога і злачынага элемэнту, каб не дапусьціць у армію гэтага элемэнту.

Ня ведае, калі будзе прызыў

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Рэдакцыя газэты «Чырвоная Полаччына» арганізавала рабкораўскі і ваенкораўскі налёт на акруговыя ўстановы з мэтаю азнаёмішча, як яны рыхтуюцца да прызыву. Налёт выявіў, што большасьць акруговых устаноў амаль што не пачала рыхтавацца. Іншыя-ж, як напрыклад, акруговы інспэктарыят асьветы, абмяжоўваецца паперкамі дырэктыўнага характару візавым органам. Цікавае становішча выяўлена ў парткалектыве чытуначнікаў, дзе сакратар парткалектыву, нават ня ведае, калі будзе прызыў.

Толькі некаторыя акруговыя праўленьні саюзаў правялі сякую-такую працу (саюз будаўнікоў і інш.). Праводзяцца гутаркі сярод прызыўнікоў, наладжваецца шчыльнейшая сувязь з падшэфнай чырвонаармейскай часьцю, склікаюцца сходы моладзі прызыўнога ўзросту і інш.

Клюбы таксама амаль што не пачалі рыхтавацца да прызыву.

Забылі саміх прызыўнікоў

БАБРУЙСК, (Наш кар.). Падрыхтоўчая работа разгарнулася своячасова. Працоўнае насельніцтва прымае актыўны ўдзел у абгаварэньні сьпісаў прызыўнікоў. Па акрузе выяўлена 148 пазбаўленых права голасу і 226 абкладзеных індывідуальным падаткам. Забясьпечана культурнае абслугоўваньне прызыўных пунктаў. Слаба вядзецца работа сярод саміх прызыўнікоў. Канфэрэнцыі адбыліся не на ўсіх раёнах.

Акрвыканком мала цікавіцца прызывам і ўсю работу ўсклаў толькі на ваенкамат. Асоавіяхім таксама стаіць у баку ад прызыву.

Прафсаюзы фармальна даюць характарыстыкі

Пры Менскім АВК зараз працуе камісія па клясавым адборы прызыўнікоў. Разглядаюцца сьпісы прызыўнікоў, якія жывуць у Менску. Маюць месца няўважлівыя адносіны прафсаюзаў да складаньня характарыстык. Асабліва фармальна падышоў саюз с.-г. рабочых. Першы дзень прызыву на акрузе—23-га верасьня.

Б. П.

Беларускае тэатр перад новым сэзонам

Сэзон пачнецца 12-га кастрычніка

Новы сэзон яўрэйскага Беларускага тэатру ў Менску пачнецца 12 кастрычніка і будзе працягвацца да 15 сакавіка.

Тэатр дасьць 80 спэктакляў—па 4 у тыдзень; па чацьвяргох, пятніцах, суботах і нядзелях. З новых п'ес, якія яшчэ ня былі пастаўлены ў Менску, трэба адзначыць — «Тойбер» Бэргельсона, «Гопля жывём»—Толера,—«Барацьба машын»—Доўгапольскага і «Амэрыка»—Гадзінэра. З мінулых пастановак у новы рэпэртуар уключаны „Ботвін", „Лекерт", «Овечий источник», «На покаянной цепи» і „Патомства". Як і мінулыя гады тэатр будзе абслугоўваць арганізаванага глядача.

Па працягу сэзону мяркуецца склікаць дзьве канфэрэнцыі рабочых глядачоў, а таксама канфэрэнцыі рабкораў разам з работнікам і газэт.

Барацьба з брушным тыфусам

Заразная больніца ня была падрыхтавана да прыёму хворых

Прэзыдыум ЦП саюзу мэдсанпрацы азнаёміўся са становішчам трэцяй заразнай больніцы ў зьвязку з эпідэміяй брушнога тыфусу і паратыфусу.

Прэзыдыум ЦП саюзу прызнаў, што з боку інспэкцыі аховы здароўя і адміністрацыі больніцы ня было падрыхтоўкі да шпіталізацыі хворых.

Зусім недапушчальным зьяўляецца адсутнасьць у больніцы выстарчальнай колькасьці бялізны, абсталяваньня і пэрсаналу.

Узьнята пытаньне перад ЦСПСБ і Наркаматам Шляхаў Зносін аб прадстаўленьні санітарных вагонаў для перавозкі хворых тыфусам на чыгунцы.

Беспрацоўныя мэдычныя сёстры і санітары, якія адмовяцца пайсьці працаваць у 3-ю больніцу, будуць зьняты з вучоту біржы працы.

Перад акруговай інспэкцыяй аховы здароўя ставіцца пытаньне аб адчыненьні ў Менску на час эпідэміі ізаляцыйнага дому.

Намечаны рад канкрэтных мерапрыемстваў па барацьбе з антысанітарыяй у горадзе.

***

Гэтымі днямі адбылася нарада санітарных і культурна-бытавых камісій ЖАКТ'аў гор. Менску, на якой сталі пытаньне барацьбы з эпідэміяй брушнога тыфусу і паратыфусу. Нарада прыняла рад канкрэтных пастаноў. Аб кожным паасобным выпадку захворваньня на тыфус санкамісіі ЖАКТ'аў павінны на відным месцы вывешваць абвестку, дзе і хто захварэў. Прапанавана кіраўніцтвам ЖАКТ'аў у сьпешным парадку зрабіць ачыстку ўсіх двароў і памыйных ям. Будуць таксама арганізаваны групы жадаючых зрабіць прышчэпкі. У працы па абсьледваньні санітарнага становішча гораду ўцягваюцца і студэнты.

Трэба адзначыць, што ня ўсе прадстаўнікі ЖАКТ'аў прысутнічалі на нарадзе. Таксама не зьявіўся і прадстаўнік БЖС.

Санітарны аддзел камгасу

У Менску ёсьць яшчэ выпадкі, калі ўсялякія нячыстоты з паглынаючых студняў ноччу выпампоўваюцца проста ў рыштакі. Такі спосаб ачысткі, праўда каштуе ня дорага, але ён вельмі шкодны.

Зараз, калі ў горадзе выбухнула эпідэмія брушнога тыфусу, такі спосаб ачысткі паглынаючых студняў зьяўляецца проста грамадзкім злом, з якім трэба змагацца.

Неяк дзіўна, што санітарны аддзел камгасу да апошняга часу выдае дазвол на ачыстку паглынаючых студняў такім «эканомным» спосабам.

І выходзіць, што адны арганізацыі з тыфусам вядуць барацьбу, а другія (санітарны аддзел камгасу) дапамагаюць яго пашырэньню.

НАГЛЯДЧЫК.

Справа Амсціслаўскага інстытуту глуханямых

Прадстаўнік НКА на працэс не зьявіўся

Выязная сэсія Аршанскага акруговага суду распачала слухаць справу працаўнікоў Амсціслаўскага інстытуту глуханямых. На лаўцы падсудных былы загадчык інстытуту Дзяшневіч, яго б. жонка Галубіцкая, выкладчык Пятроў з сваёю жонкаю, Маронка і інш.

Як ужо ў свой час паведамлялася ў газ. «Зьвязда», гэтая вусім чужая савецкай грамадзкасьці сямейка людзей ня мела нічога агульнага з савецкаю школаю. Замест выхаваньня Дзяшневіч і яго памочнікі сыстэматычна зьбівалі дзяцей, п'янствавалі і наогул вялі самым безгаспадарчым спосабам справы ў інноты туце.

Усе гэтыя факты на судзе пацьвердзіліся.

Характэрна адзначыць, што Аршанскі акруговы інспэктарыят асьветы ў асобе тав. АКУЛІКА, робячы рэвізію пастаноўні работы ў Інстытуце, у сваім акце напісаў, што ў Амсціслаўскім інстытуце глуханямых справа пастаўлена добра.

На глядзячы на тое, што акруговы суд некалькі разоў пасылаў прапановы НКА выслаць свайго прадстаўніка на працэс, ніхто з НКА не зьявіўся. Суд працягнецца некалькі дзён.

Паведамленьні

АПА Менакругкому паведамляе, што з панядзелка, 16 верасьня, пачнецца прыём у вячэрнюю савецкую партыйную школу. Сакратаром ячэек: ф-кі «Беларуска», друкарні «Зьвязда», зав. «Беларусь», Абойнай ф-кі, Працкалектыў краўцоў, 1-я больніца — прапануецца выслаць усіх слухачоў, жадаючых паступіць у ВСПШ, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні 2-й сямігодкі (Ленінская, 21, супроць пошты).

Сакратаром ячэек: Працасьветы, Менакрфа, Нархарч, Дзяржгандлю, Саюзхлебу, Наркампрацы — прапануецца выслаць членаў сваіх ячэек, жадаючых паступіць у ВСПШ, а 8 гадзіне ўвечары 16-га верасьня, у вышэйпаказанае памяшканьне.

Прысутнасьць апорграў вышэйпаказаных ячэек у часе камплектаваньня абавязкова.

— Сёньня, 17 верасьня, а 6 гадзіне ў памяшканьні пэдфаку адбудзецца агульны партыйны сход калектыву КП(б)Б БДУ.

— Адчынены сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы замест аўторна адбудзецца ў сераду, 18 верасьня—а 7 гадзіне ўвечары ў Доме Асьветы.

Парадак дня: Абгаварэньне характарыстыкі ячэйкі, дадзенай Фрунзаўскім РК КП(б)Б.

Запрашаюцца беспартыйныя асьветнікі г. Менску.

— У сераду, 18 верасьня, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні агітпропгабінэту АК КП(б)Б (клюб К. Маркса, другі паверх, уваход з вуліцы Энгельса) адбудзецца нарада кіраўнікоў антырэлігійных гурткоў ячэек СВБ г. Менску.

На нараду выклікаюцца наступныя таварышы: Басянзон, Барштэйн, Дарафеева—ад сталовай МЦРК; Марголін—завод „Камунар"; Штэйн—п-т. кантора; Занаменны і Радзівінаў—саюз будаўнікоў; Углік і Нікіцін—саюз нархарч; Прутнікаў—цэнтральны дом селяніна; Міхайлаў—шкловавод „Пралетары"; Трыбуць—войлачная ф-ка; Анкудовіч—зав. «Чырвоная Зорка»; Лікарпенка—зав. «Бальшавік».

Яўка вышэйпамянёных таварышоў абавязкова без спазьненьня.

— 18-га верасьня, а 7 гадзіне ўвечары, у клюбе Карла Маркса адбудзецца агульна-гарадзкі сход жаночага актыву—савецкага, прафэсійнага, кааперацыйнага, дэлегатак і рабкорак з наступнай абвесткай дня:

1) Аб хлебазагатоўках, 2) аб манэўрах і ўдзеле жанчын у іх.

— Бюро калектыву КП(б)Б БДУ прапануе ўсім сябрам і кандыдатам КП(б)Б, якія залічаны на хэміка-тэхналёгічны факультэт, узяцца на вучот у бюро калектыву (Земляробскі зав., № 4, аўдыторыя № 36) у тыднёвы тэрмін.

18-га верасьня, а 7-й гадзіне ўвеч., у памяшканьні 2-й сямігодкі (Ленінская вул., № 21, супроць пошты) будзе адбывацца камплектаваньне ВСПШ. Павінны зьявіцца члены наступных ячэек: вадаканалу, будаўнікоў, заводу «Пралетары», браварнага, Наркамзему, Беларуск. Акадэм. Навук, ЦСУ, хэмікаў, Эльводу.

У часе камплектаваньня прысутнасьць сакратароў альбо апорграў вышэйпаказаных ячэек абавязкова.

— Кастрычнікавы райком КП(б)Б паведамляе, што ў сераду, 18-га верасьня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні школы № 20 (вул. 1-я Лекерта) будзе праводзіцца набор слухачоў у адзіную райпартшколу наступных парт. ячэек: войлачнай ф-кі, Наркамфіну, Наркамюсту, Белсельсаюзу, цэнтральнага радзільнага дому, ЦІП'у і разьніцы.

Усе таварышы гэтых парт. ячэек, якія жадаюць займацца ў райпартшколе, павінны зьявіцца своячасова.

— ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ ІМЯ К. МАРКСА. З 18-га верасьня па 1-е кастрычніка праводзіцца перавучот чытачоў бібліятэкі Дому.

Перавучот адбываецца што дня ад 6 да 10 гадз. увеч., па панядзелках і аўторках ад 12 гадз. дня да 6 гадз. ув.

Тыя, што ня зьявяцца на перавучот, будуць лічыцца выбыўшымі.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. ШІРАЕВА.
АПОШНІ РАЗ
Ад аўторка, 17 верасьня **„ЖРИЦА ОГНЯ"**
у 3-х дзеях Валенцінава.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА"
Сёньня і заўтра апошнія дні дэманстрацыі 2-й і апошній серыі гістарычнага фільму
ДЖАНКІ ў 7 част.
Звыш праграмы кіно-хроніка Белдзяржкіно № 21
1. Дзень калектывізацыі: (чырвоны абоз, мыцьцё ў памуне сьвята калектывізацыі)
2. Пахаваньне пісьменьніка П. Трусы.
3. Тон с (слаборніцтва Менск—Кіеў)
Пачатак сэансаў а 7 гадзіне ўвечары. Каса—ад 5 гадз.
УВАГА! Чарговая пастаноўка **Джэнтльмэн і певень**

КІНО Інтэрнацыянал — Ад панядзелка, 16 верасьня, мастацкі бытавы фільм **ПЕРАГОН СЬМЕРЦІ** драма ў 6 частках. Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 5 г. 30 м.

КІНО Пралетарый — Ад панядзелка, 16 верасьня. вясёлая камэдыя сэзону **„ШЧАСЬЛІВЫЯ КОЛЬЦЫ"** Звыш праграмы кіно-хроніка № 46 Пачатак а 7 пал. гадз. Каса—ад 6 гадз

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Гістарычны фільм з эпохі Пугачоўшчыны на Русі **БУЛАТ-БАТЫР** у 7 частках. Кіно адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 х., 2-га—а 5 г. Цана білета 10 к. Месцы нумараваныя.

КІНО Спартак — Ад панядзелка, 16 верасьня, чарговая пастаноўка. Сэнсацыя Нью-Ёрку, Бэрліну і Парыжу **ГАРПУН** (Забойства капітана) Драма ў 8 частках. Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 5 г. 30 м.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня

ПРОЧТИ И ПОДПИШИСЬ!

1 ОКТЯБРЯ ВЫХОДИТ НОМЕР ПЕРВЫЙ РЕОРГАНИЗОВАННОГО МАССОВОГО ИЛЛЮСТРИРОВАННОГО ЕЖЕНЕДЕЛЬНИКА

„РАДИОСЛУШАТЕЛЬ"

ЖУРНАЛ

ОСВЕЩАЕТ вопросы радиовещания и радиофикации Союза и критикует радиовещание центральных и местных станций.

тесно СВЯЗЫВАЕТСЯ с городской и сельской общественностью, кружками ОДР, освещая жизнь, нужды и рост самых низовых обществен. единиц.

ОТВОДИТ место статьям радиоспециалистов и радиолюбителей, активно участвующих в строительстве страны.

РАЗРАБАТЫВАЕТ программы радиовещания и печатает подробные программы 22-х центральных и областных длинноволновых и коротковолновых станций и заграничных станций Германии, Австрии, Чехо-Словакии, Швеции, Дании, Англии, Голландии, Франции, Италии, Финляндии и Турции.

ПЕЧАТАЕТСЯ на новейших заграничных машинах по способу мелко типто в многокрасочной обложке.

РАССЫЛАЕТСЯ по Союзу с таким расчетом, чтобы радиослушатели на местах имели программу ко дню передач.

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ: с 1 окт. до конца года—2 р. 25 к., на 1 мес.—80 к. Цена отд. №—20 коп. Подписка принимается НА ПОЧТЕ всюду.

Издательство НКП и Т Москва 9, Тверская, 17.

ПОЛЫЙ ПЕРЕВОРОТ в СЧЕТНОМ ТРУДЕ.
ЗАМЕНА ДОРОГОСТОЯЩИХ АРИФМОМЕТРОВ.
Счетный прибор „ЧЕРНЯК" превращает любые конторские счеты в АРИФМОМЕТР
Сч. пр. „ЧЕРНЯК" дает моментально девять готовых произведений любого числа. Абсолютная точность. Сч. пр. „ЧЕРНЯК" заменяет умножение сложением, а деление вычитанием. Готовых произведений. Скорость работы. Полное отсутствие умственного напряжения, Сч. пр, „ЧЕРНЯК" производит вычисление процентов, переводит метрические меры в русские и обратно. Дает готовые результаты при умножении на дроби с однозначным знаменателем, Простота в работе. Бесшумность. Сч. пр. „ЧЕРНЯК" необходим бухгалтерам, счетоводам, таксировщикам, инженерам, техникам, десятникам, прорабам, конструкторам и вообще всем, чья работа связана с точными расчетами. К каждому прибору прилагается полное руководство: для ознакомления последним нужно не больше 25-30 мин.
Цена прибора 15 руб. без пересылки и упаковки.
Прибор высылается по получению задатка в размере 50 проц. Присланные всю стоимость вперед за пересылку не платят.
МОСКВА, Крымский пер. д. № 3-5. Тел.:Замоскв. 1-31. Заказы и корреспонденции, адресовать: МОСКВА:—Почтамт почт. ящ. 875-22.
Т-ву „Изобретатель-Рационализатор".
К сведению изобретателей: Т-во „Изобретатель-Рационализатор" организовано специально для эксплоатации изобретений. К реализации прин. рентабельные изобретения массового характера.

На шматлікія запытаньні аб характары радыё-унівэрсытэту,
праўленьне радыё унівэрсытэту
АДКАЗВАЕ:
РАДЫЕ-УНІВЭРСЫТЭТ ня вучыць радыё-тэхніцы, а ставіць сваёй мэтай павысіць агульны і палітычны ўзровень шырокіх рабочых і сялянскіх мас, выпрацаваўшы для гэтага адпаведны вучэбны плян, у якім маюцца побач з грамадазнаўчымі дысцыплінамі яшчэ і спэцыяльныя для прамысловага і сельска-гаспадарчага факультэту.
Слухачы радыё-унівэрсытэту, не адрываючыся ад сваёй працы, слухаюць лекцыі праз радыё-прыёмнікі або ў клюбах і хатах-чытальнях, дзе ёсьць свае радыё-прыёмнікі.
Тэрмін падачы заяў працягнут да 1-га кастрычніка г. г.
Аб падрабязнасьцях чытайце газ. „ЗЬВЯЗДА" № 177 ад 6-га жніўня, газ. «РАБОЧИЙ» за № 194 (619) ад 27 жніўня і газ. «СЛАВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» за № 189 ад 21-га жніўня г. г.
Праўленьне радыё-унівэрсытэту.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЯДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА
Денінская, побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-60
АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч
Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраныя, хірургічныя, жаночыя, зубныя, вока нэрвоў, вуха, горла, носа і скуры
ПРЫМАЮЦЬ ПА ПАПЯРЭДНІМ ЗАПІСЕ
Па хваробах вока—праф. Камінскі па панядзелках і чацьвяргох ад 3 гадз. дня.
Па страўн.-кішэчн.—дацэнт Манасэвіч па аўтораках і чацьвяргох ад 8 гадз. увеч.
Па хваробах скуры—д-р Розэнталь па аўтораках і суботах ад 8 г. увеч.
Фізіятрычны габінэт: кварц, электра і сьвета-лячэньне.
Рэнтгенаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых
Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.
— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

З ЗАКАЗАМІ — ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"—МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63. 3-ЦІ ПАВЕРХ
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ,